ЭДЕ...А

Орган Центральнага Камітэту Камуністычнае ... Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 305 (3903)
АЎТОРАК, 30 СЬНЕЖНЯ
Цана нумару 5 кап.

Бібліятэка ВСНХ СССР
Дек. Зьв.-I
Інв. №

Узяць баявыя тэмпы ў падрыхтоўцы да бальшавіцкай пасеўнай кампаніі

Пленум ЦК і ЦКК УсесКП(б), які адбыўся тэтымі днямі, вызначыў праграму разгортвання сацыялістычнага будаўніцтва ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Гэта праграма далейшага разгортвання сацыялістычнага наступлення па ўсім фронце яшчэ больш паспарае тэмп росту сацыялістычнай індустрыі і сацыялістычнага земляробства.

На базе разгорнутага будаўніцтва саўгасаў і калгасаў трэці год пяцігодкі павінен даць новы магутны ўздым працаўцыйных сіл у сельскай гаспадарцы, буйнейшыя зрухі ў галіне жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Праграма трэцяга году пяцігодкі па сельскай гаспадарцы перакінула забяспечыць хуткі рост вытворчасці сельска-гаспадарчага сырцу для прамысловасьці, мясных і гародных культур для рабочага забеспячэньня.

Галоўныя і адказныя задачы стаяць перад БССР, якая зьяўляецца ў сыстэме Савецкага Саюзу асноўным раёнам сьвінагадоўлі (жывёлагадоўлі наогул) і тэхнічных культур (на ільне і канаплях). Праграма другой бальшавіцкай вясны прадугледжвае на грунце сацыялістычнай рэканструкцыі такія карэнныя зрухі ў сельскай гаспадарцы БССР, якія забясьпечаць пасьпяховае выкананьне пастаўленых перад намі задач. Мы павінны зрабіць круты паварот у бок спэцыялізацыі нашай сельскай гаспадаркі ў напрамку максымальнага разьвіцця жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Толькі ў гэтым выпадку БССР забясьпечыць пасьпяховае ажыцьцяўленьне вялізарнага народна-гаспадарчага плану ўсяго Савецкага Саюзу на 1931 год.

Яшчэ 3 сьнежня ўрад БССР намеціў асноўныя палітычна-вытворчыя мерапрыемствы веснавой пасеўнай кампаніі і распаканаваў сельска-гаспадарчым арганізацыям і мясцом неадкладна разгарнуць іх ажыцьцяўленьне. Напомнім аб галоўных мерапрыемствах. БССР павінна давесьці плошчу пасеву сацыялістычнага сэктару да 37 прац. усяго пасеву ільну. Вытворчым каапэраваньнем да веснавой сяўбы павінны быць ахопнены масы адзіначаснікаў — беднякоў і сераднякоў, якія не ўвайшлі ў калгасы. Яравы ільн паравяльна з плошчай пасеву увесну 1930 году павялічваецца на 17.4 прац. Трэба ажыцьцявіць рад эграмерапрыемстваў, каб дабіцца значнага павялічэньня ўраджайнасьці па ўсіх сэктарах і асабліва па сацыялістычным. У цэнтр увагі пастаўлена пашырэньне плошчы пад тэхнічнымі культурамі на 90.000 гэктараў, пад кармавымі каранеплодамі — на 80.000 гэктараў. Прадугледжан вялізарны рост пасеваў траў і сілосных культур.

У ПРАЙШЛО КАЛЯ 3-х ТЫЛЬНЯЎ З ДНЯ АПУБЛІКАВАНЬНЯ ГЭТАЙ ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ, МІЖ ТЫМ, ПАДРЫХТОЧАЯ РАБОТА ДА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ВЫЗНАЧАНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ЯШЧЭ ФАКТЫЧНА НЕ РАЗГОРНУТА. Даволі спыніцца на кодзе разгортвання асноўных у цяперашні момант мерапрыемстваў — на рамонце, засыпцы насенных фондаў, складаньні калгасных вытворчых плянаў, прасоўваньні плянаў уніз — каб у гэтым упэўніцца.

Бясспрэчны факт, што НІ АДНА сельска-гаспадарчая арганізацыя да гэтага часу ... НЕ РАЗГАРНУЛА РАМОНТНАЙ КАМПАНІІ, ня ўжыла энэргічных мер да прывядзеньня ў парадак сеткі рэмонтных майстэрань. Асабліва АБУРАЮЧАЕ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ ТРАКТАРАЦЭНТРУ, які абавязан выканаць скпаданы рамонт трактароў і сельска-гаспадарчых машын калгасаў, ня кажучы ўжо аб яго ўласным трактарным парку. Павольнасьць Трактарацэнтру ставіць пад рэальную пагрозу зрыву ўсю рамонтную кампанію па сацыялістычным сэктары. Становішча пагыбляецца непаразумеваньнем і бязініцыятыўнасьцю самім КАЛГАСНЫХ І САЎГАСНЫХ ОРГАНАЎ, якія непасрэдна зацікаўлены ў своечасовым скончаньні рамонту. Становішча, якое стварылася на гэтым важнейшым вучастку падрыхтоўкі да сяўбы, наводзіць на думку, што НАРКАМЗЕМ БССР, які абавязан кваліфікаваць дзейнасьць усіх сельска-гаспадарчых арганізацый, які фактычна адказвае за пасьпяховае правядзеньне рамонтнай кампаніі па БССР у цэлым, — гэтай справай ня кіруе і яўна невыстарчально цікавіцца.

ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА ПРАХОДЗІЦЬ ЗАСЫПКА НАСЕННЫХ ФОНДАЎ У КАЛГАСАХ. На 25 сьнежня заданьне выканана толькі на 27,2 прац. Прычын засыпкі ідзе, галоўным чынам, за кошт правых збожжавых культур. Насенныя-ж фонды кармавых і тэхнічных культур стараюцца недапушчальна позна і складаюць мізэрны процант. Ня ўсе раёны ўсьвядомілі вялізарнай важнасьці своечасовай і поўнай засыпкі насенных тэхнічных і кармавых культур. Месцы на ўплываюць, што без насеньня гэтых культур немагчыма поўнасьцю выканаць дырэктыву партыі і ўраду аб пашырэньні плошчы пад ільном, каноплямі і травамі. Зажест мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў у значнай колькасьці раёнаў усё яшчэ пануе апартуністычная стаўка на заваз насеньня тэхнічных і кармавых культур з іншых раёнаў.

НЯ ЛЕПШ СТАЦЬ СПРАВА З ДАВЯЗДЗЕНЬНЕМ ПАСЕЎНЫХ ПЛЯНАЎ ДА СЕЛЬСАВЕТАЎ І КАЛГАСАЎ. У паасобных мясцох гэта мерапрыемства толькі зараз праводзіцца. У пераважнай-жа большасьці раёнаў з гэтай справай яшчэ не сьпяшаюцца. Павольнасьць раённых арганізацый моцна адбіваецца на разгортаньні падрыхтоўкі да сяўбы непасрэдна ў нізох, тармозіць давядзеньне сельсаветамі плянаў да асобнага двара.

У прыватнасьці трэба адзначыць, што яшчэ не разгарнулася складаньне вытворчых калгасных плянаў. Гэта фактычна не дае магчымасьці калгасам распачаць шырокую падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны.

НЯ МОЖА ЗАДАВОЛІЦЬ ХОД АРГАНІЗАЦЫІ МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ І ПАДРЫХТОЎКА ІХ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ. Між тым, у 1931 годзе МТС набываюць у нас вялізарнейшае палітычна-гаспадарчае значэньне. Даволі сказаць, што колькасьць МТС да веснавой сяўбы даводзіцца да 20-22 з завозам каля 1.500 новых трактараў. МТС зьявяцца вялізарным фактарам у разгортаньні калгаснага руху, асабліва ў раёнах тэхнічных культур і жывёлагадоўлі. Неабходна падкрэсьліць, што партыйныя і савецкія арганізацыі раду раёнаў не аддаюць належнай увагі пытаньням арганізацыі МТС, не дапамагаюць у рабоце ўжо існуючым МТС. Ступень росту калгаснай хвалі ў раёнах дзейнасьці некаторых МТС сьведчыць аб яўна невыстарчальнай іх масавай і арганізацыйнай работы. Усё гэта зьяўляецца таксама вынікам слабога, нявыразнага кіраўніцтва работай і арганізацыяй МТС.

Не падлягае сумненьню, што АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ВЯЛІЗАРНАЙ ПРАГРАМЫ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ Ў БССР У АСНОЎНЫМ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ, ад арганізацыі новага калгаснага прыпіву. Толькі ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб шырокім разгортаньні масавага калгаснага руху на аснове ленінскага прынцыпу добраахвотнасьці забясьпечыць патрэбныя нам зрухі ў сельскай гаспадарцы БССР на працягу 1931 году.

АПОШНІЯ МЕСЯЦЫ ПАКАЗВАЮЦЬ ДАЛЕЙШЫ РОСТ КАЛГАСНАГА РУХУ Ў БССР. На сёньняшні дзень у цэлым па рэспубліцы калектывізавана каля 15 проц. бяднацка-сераднацкіх двароў. Тысячы калгаснікаў, загартаваных у барацьбе з кулаком, высока трымаюць сьцяг калектывізацыі. РАД КАЛГАСАЎ ПЕРАТВАРЫЛІСЯ Ў БАЯВЫЯ ШТАБЫ ПА РАЗГОРТАНЬНІ КАЛГАСНАГА РУХУ. Аб гэтым сьведчаць шматлікія факты, аб якіх мы друкуем амаль штодзенна ў нашай газэце. Яркім прыкладам могуць служыць калгасы імя Сталіна і «Чырвоны партызан» (Лоеўскі раён), якія за апошнія тры тыдні вырасьлі ў чатыры разы па колькасьці членаў. Варбсвачныя камісіі калгасаў «Рухавік» і «Энгельс» (Уваравіцкі раён), «Чырвоны партызан» і «Расьсьвет—пераможца» (Жлобінскі раён) арганізавалі каля 20 ініцыятыўных груп і 12 новых калгасаў. Такавы вынікі паказу дасягненьняў пешых калгасаў, па-бальшавіцку разгорнутай масавай работы.

Аднак, тэмп разгортаньня калгаснага руху ва многіх раёнах БССР ня можа быць прызнаны здавальняючым. Характэрна, што ў такіх раёнах, калі нават там і пачалася падрыхтоўка да веснавой сяўбы, гэта падрыхтоўка НЯ ЎВЯЗВАЕЦЦА з арганізацыяй новага прыпіву ў калгасы. Падрыхтоўка да веснавой сяўбы тут адарвана ад задач калектывізацыі. Шматлікія весткі з месц гавораць аб вялізарным руху адзіначаснікаў бяднацка-сераднацкіх мас за калгас. Сотні ініцыятыўных груп і камісій арганізаваліся на працягу апошніх тыдняў, але афармленьне іх у калгасы тармозіцца вельмі часта апартуністычнымі элементамі, якія яшчэ ня выгнаны з партыйных і калгасна-зямельных арганізацый. Мы нагадваем такія факты, калі калгас неафармлен на працягу месяцаў, калі ніхто не аказвае новым калгаснікам канкрэтнай дапамогі ў арганізацыі калектыўнай гаспадаркі.

У радзе раёнаў мясцовыя партыйныя арганізацыі яшчэ ня сталі на чале гэтага вялізарнага руху за калектывізацыю, не працуюць над пашырэньнем гэтага руху, над замацоўваньнем ужо існуючых калгасаў.

Правыя апартуністы імкнуцца падарваць вялізарныя посьпехі партыі на фронце калгаснага будаўніцтва, затармазіць далейшую калектывізацыю. Паведамленьне са Сьмілавіч, якое было гэтымі днямі зьмешчана ў «Зьвязьдзе», зьяўляецца яркім доводам кулацкай сутнасьці правых-апартуністычнай тэорыі і практыкі. Дзеолі адзначыць, што ў адзін з калгасаў гэтага раёну ў якасьці члена калектыву прыняты мясцовы... поп. Кулакі разгаркулі шапёную работу па падрыве існуючых у Драчкоўскім сельсавеце калгасаў, не сустракаючы зразумела, ніякага адпору ад мясцовых апартуністаў, якія дапусьцілі прыём папа ў калгас.

Кулакі і іх агенты апартуністы па меры разгортваньня падрыхтоўкі да сяўбы і калектывізацыі будуць усямерна імкнуцца сарваць гэту падрыхтоўку і самую калектывізацыю. Партыйныя арганізацыі, батрацтва і беднота павінны праяўляць максымальную клясавую пільнасьць і даваць самы рашучы адпор ўсялякім спробам кулака і апартуністаў перашкодзіць ажыцьцяўленьню праграмы другой бальшавіцкай вясны.

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ШМАТЛІКІЯ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ АБ РАБОЦЕ З БЕДНАТОЙ, У ЗНАЧНАЙ КОЛЬКАСЬЦІ РАЁНАЎ ПРАЦА З БЕДНАТОЙ УСЁ ЯШЧЭ НЕ РАЗГОРНУТА, АСАБЛІВА Ў КАЛГАСАХ. Трэба рашуча пакончыць з правапартуністычнай недазрэлай работы з беднатой, цьвёрда памятаючы, што калгаснікі, батрацтва і беднота зьяўляюцца магутнай апорай партыі і савецкай улады ў вёсцы, што без належнай арганізацыі іх на барацьбу з кулаком, падкулачнікам немагчыма пасьпяховае ажыцьцяўленьне сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

Мы да гэтага часу ўсё яшчэ не дабіліся зруху ўахопе вытворчым каапэраваньнем тых беднякоў і сераднякоў, якія яшчэ не ўвайшлі ў калгасы. Колькасьць вытворчых аб'яднаньняў налічваецца дзесяткамі. У гэтай галіне патрэбен самы рашучы зрух. Работа па вытворчым каапэраваньні павінна быць адзэй з важнейшых задач арганізацый.

Апошнія дні далі факты, якія сьведчаць аб спробах у паасобных раёнах замяніць масавую работу па арганізацыі калгасаў дэкрэтаваньнем, заданьнямі зьверху. Гэтыя спробы паўтараюць пташкін «левых» перагібы і выяўляюцца ў імкненьнях некаторых раёнаў (напрыклад, Тураўскага) давесьці кантрольныя лічбы па калектывізацыі да сельсаветаў. Адсюль недалёка да давядзеньня кантрольных лічбаў па калектывізацыі да вёсак і нават... да двара! З такога роду спробамі «лявацкага» тыпу падмяніць ленінскі прынцып добраахвотнасьці пры ўступленьні ў калгасы загадамі, націскам зьверху павінна быць паведзена непрымірымае змаганьне, як з практыкай, якая дапамагае кулаку ў яго антыкалгасным шкодніцкай рабоце.

САМУЮ БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ ТРЭБА АБВЯСЬЦІЦЬ АПАРТУНІСТЫЧНЫМ СПРОБАМ ЗЬМЕНШЫЦЬ ЗАДАНЬНІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ, АДЦЯГНУЦЬ ТЭРМІНЫ ВЫКАНАНЬНЯ АСНОЎНЫХ У СУЧАСНЫ МОМАНТ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, устанаўленых Саюзным Наркамземам. Задачы сельска-гаспадарчай кампаніі 1931 году патрабуюць скарачэньня тэрмінаў падрыхтоўкі да весны і своечасовага скончаньня гэтай падрыхтоўкі. У сьвятле гэтага пасьпяховасьць у разгортаньні рамонту, засыпцы насенных фондаў, складаньні калгасных вытворчых плянаў, прасоўваньні плянаў да сельсаветаў і двара зьяўляецца яшчэ больш недапушчальнай і прымае характар апартуністычнага сабатажу мерапрыемстваў партыі і ўраду. Тэрміны, устаноўленыя Саюзным Наркамземам для БССР, павінны быць захаваны ва што-б там ні стала. МЫ ПАВІННЫ СКОНЧЫЦЬ РАМОНТ У АСНОЎНЫМ ДА 1 САКАВІКА, ЗАСЫПКУ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ І ДАВЯЗДЗЕНЬНЕ ПЛЯНАЎ — ДА 1 ЛЮТАГА. Баявая задача партыйных арганізацый, усёй зямельна-калгаснай сыстэмы — скончыць ажыцьцяўленьне ўсіх мерапрыемстваў да веснавой сяўбы ў тэрміны, вызначаныя Саюзным Наркамземам.

Зарука посьпеху — шырокая мабілізацыя мас калгаснікаў і адзіначаснікаў — беднякоў і сераднякоў — на выкананьне задач веснавой сяўбы, высунутых партыяй і ўрадам. Толькі арганізацыяй мас на барацьбу з кулаком, з апартуністычнай бязьдзейнасьцю і самацёкам, з канкрэтнымі носьбітамі бюракратызму і цяганіны мы пераможам усе труднасьці, якія спаткаем на шляху да ажыцьцяўленьня праграмы бальшавіцкай сяўбы.

Неабходна ўсю падрыхтоўку да веснавой кампаніі арганічна зьвязець з усёй праграмай сацыялістычнага наступленьня ў вёсцы, з разгорнутым наступленьнем на кулака, з уцягваньнем мас адзіначаснікаў беднякоў і сераднякоў у калгасы. Толькі такая падрыхтоўка забясьпечыць нам правядзеньне суцэльнай калектывізацыі БССР да канца пяцігодкі і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва, як класы.

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў

Заслухаўшы паведамленьне тав. Хацкевіча аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што да апошняга часу работа па перавыбарах саветаў не разгорнута яшчэ, як важнейшая палітычная работа партыйных арганізацый. Невыстарчальна разгорнута работа з беднатой, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі ў радзе месц слаба прымаюць удзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі, друк зусім невыстарчальна заваграў увагу па важнейшых пытаньнях справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Задачы справаздачна-перавыбарчай кампаніі, вызначаныя ў радзе дырэктыў ЦК КП(б)Б, у асаблівасьці асноўныя задачы ўмацаньня ролі саветаў у правядзеньні генэральнай лініі партыі і ўмацаваньня і разьвіцьця калгаснага руху пэрз саветы і пры пасярэдніцтве саветаў, у цэлым радзе раёнаў выконваюцца зусім нездавальняюча. Да сёньня невыстарчальная ўвага партыйных арганізацый да шматлікіх фактаў абвастранага клясавага змаганьня, якое разгортваецца вакол перавыбараў саветаў. Адзначэна гэтаму не заўсёды знаходзяць належны адпор «проіскі» і замоўленьні кулацтва.

Выходзячы з гэтага, Бюро ЦК КП(б)Б прапануе ўвагу ўсіх райкомаў КП(б)Б і фракцый гайвыканкомаў на неабходнасьць мабілізацыі ўвагі ўсёй партыйнай арганізацыі і пралетарскай грамадзкасьці для пасьпяховага правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі, маючы на ўвазе неабходнасьць цьвёрдага выкананьня наступных задач і дырэктыў:

1. Справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў, будучы звязанай з правядзеньнем усіх чарговых палітычна-гаспадарчых кампаній, павінна ўзмацніць кіруючую ролю саветаў у калгасным руху і пырока садзейнічаць арганізацыі далейшага руху бяднацка-сераднацкіх гаспадарак у калгасы.

2. Даручыць ЦК ЛКСМ безадкладна прыняць рашучыя меры да ўзмацненьня актыўнага ўдзелу камсамольскіх арганізацый у справаздачна-перавыбарчай кампаніі і ўцягненьня камсамольцаў у склад саветаў. Правяраць фактычнае выкананьне пасылкі 300 камсамольцаў для пастаяннай работы ў сельсаветах.

3. Прапанаваць фракцыям прафсаюзных арганізацый прыняць безадкладныя меры на шырокім удзеле прафсаюзных арганізацый у перавыбарах сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў, а таксама праверыць сапраўднае ажыцьцяўленьне мабілізацыі і пасылкі на пастаянную работу ў саветах 200 сельгаспрабочых і 50 батракоў.

4. Выходзячы з раней даных дырэктыў, паказаць райкомам КП(б)Б на неабходнасьць забясьпячэньня ў складзе сельсаветаў партыйнага і камсамольскага ядра, рабочых з «25-тысячнікаў», сельгаспрабочых, батракоў, беднякоў, калгаснікаў і актыву перадавых сераднякоў як у складзе пакала выбіраемых саветаў, так і асабліва забясьпечыць кіруючы склад найленшымі работнікамі вёскі, якія могуць ажыцьцяўляць кіруючую ролю ў правядзеньні генэральнай лініі партыі на месцах.

5. Адзначаючы некаторае павялічэньне колькасьці выбіраемых жанчын у саветы, прапанаваць райкомам КП(б)Б зьвярнуць увагу і прыняць рашучыя меры як да больш поўнага ўцягненьня жанчын у справаздачна-перавыбарчую кампанію, так і да забясьпячэньня іх выбараў у склад сельсаветаў і кіруючых органаў — прэзыдыумаў сельсаветаў.

Зьвярнуць увагу сіроцінскага, гарадоцкага, гроскага, барысаўскага і бярэзінскага райкомаў КП(б)Б на зусім нездавальняючы процант яўкі выбіраемых жанчын у саветы.

6. Даручыць райкомам і гарадзкім камітэтам КП(б)Б зараз-жа прыняць адпаведныя меры для найпрыгажэйшага разгортваньня і падрыхтоўкі справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсаветаў.

7. Адзначаючы, што друк аддаваў мала ўвагі справе перавыбарчай кампаніі і мабілізацыі мас на выкананьне асноўных задач кампаніі і самому ходу перавыбараў, Бюро ЦК КП(б)Б прапануе ўсім цэнтральным і мясцовым газэтам зараз-жа разгарнуць шырокае асьвятленьне палітычных задач і ходу ўсёе справаздачна-перавыбарчае кампаніі.

8. Партарганізацыі КП(б)Б павінны забясьпечыць у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі вырашэньне, як адной з асноўных задач, узмацненьне кіруючай ролі саветаў, карэнную перабудову работы саветаў тварам да вытворчасьці, тварам да калгасаў, ачыстку саветаў ад правых і «левых» апартуністычных элементаў, забясьпечыць ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі ў практычнай дзейнасьці саветаў.

Разлічы аб тым, што яны жадаюць, шля- | ...ці і ліквідацыю на гэтай аснове | ...арганізацыі друк сведчыць пры усіх ...

ПАДРЫХТОЎКА ІНТЭРВЭНЦЫІ СУПРОЦЬ СССР— на поўным хаду

ВАТЫКАНСКІ „ЗВАНАР" ЗНОЎ НА СЦЭНЕ

МІЛЬЯРДНЫЯ ЎЗБРАЕНЬНІ ФРАНЦУСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ

ПАРЫЖ, 28. Тав. Кашэн выкрывае ў сёньняшнім нумары «Юманіте» новыя нахлёпы падрыхтаванай Францыі. Ён паказвае, што ня толькі павялічваецца з кожным годам нацыянальны бюджэт Францыі, але растуць таксама скрытыя асыгнаваньні па вайсковым патрэбам, якія праводзяцца на іншых артыкулах бюджэту. Так, да 12½ мільярдаў франкаў, праведзеных на бюджэце вайсковага міністэрства, трэба дадаць 2½ мільярды кредытаў міністэрства авіяцыі, сотні мільёнаў, асыгнаваныя па бюджэце міністэрства ўнутраных спраў на ўтрыманьне жандармерыі. Да гэтага бюджэту трэба далучыць 800 мільёнаў, адпушчаных на падрыхтаваньне запасаў узбраеньня, нарэшце, 3 мільярды, асыгнаваныя на пабудаваньне ўмацаваньняў на ўсходняй мяжы Францыі. Да гэтых асыгнаваньняў Францыі трэба, наводле цьверджаньня тав. Кашэна, дадаць пазыкі, даныя Румыніі, Польшчы і іншым малым дзяржавам, якія знаходзяцца ў васальнай залежнасьці ад Францыі.

Далей, тав. Кашэн выкрывае існаваньне новага артыкулу ў бюджэце, які посьпех фактычна ваенны характар. Гэта —асыгнаваньне па бюджэце 2½ мільярдаў на пабудову стратэгічных чыгунак для падрыхтоўкі да будучай вайны. Праект гэтых кредытаў, фігуруючых па бюджэце міністэрства грамадзкіх работ, ухвалены нацыянальнай эканамічнай радай, у склад якое ўваходзяць і Пуанкарэ і рэфармісцкі лідэр Жуо. Пытаньне аб гэтых кредытах на пабудову стратэгічных шляхоў адносіц, якіх так дабіваецца французкі генэральны штаб, перайшло цяпер на зацьвярджаньне палаты депутатаў і, як трэба чакаць, будзе там ухвалена. Тав. Кашэн лічыць праўдападобным, што кредыты на пабудову стратэгічных чыгунак па ўсходняй і паўночна-ўсходняй мяжы Францыі будуць і ў далейшым значна павялічаны.

У заключэньне тав. Кашэн завастрае увагу французкіх пралетараў на пытаньні аб крывадушнай казуцы французкага ўраду і на ўдзеле рэфармістаў у падрыхтоўцы калініградзкай бойні. (ТАСС).

Крывавая здача ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР

БЭРЛІН, 23. Пана Пій з нагоды «калядзі» сказаў праграмную прамову перад сходам кардыналаў, прелатаў і інш. прадстаўнікоў Ватыкану. Паказаўшы на вострасьць эканамічнага крызісу і вялізарны рост беспрацоўя, пана заклікаў да таго, каб «замест барацьбы дабівацца брацкай узаемнай работы розных кляс». Потым ён сьпыніўся на «руйнуючай прапагандзе, зрываючай усякі парадак, якая зьяўляецца ворагам рэлігіі і перадаецца знатнымі матэрыяльнага добрабыту».

У далейшым палава Ватыкану ўжо без усялякіх выкручваньняў адкрыта сказаў, куды ён меціць. «Перш за ўсё,— сказаў ён,—мы павінны маліцца богу за ўсіх гэроеў, якія ў бы і в любасьці да хрыста пакутуюць у Расіі і ў Сібіры і падрыхтоўваюць новае нарадженьне хрыста па гэтай вялізарнай тэрыторыі». Тут-жа ўсім адкрыта спроз «божественные» вусны прагучэла крывавая здача ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР. Пій заклікаў таксама да інтэрвэнцыі супроць рэвалюцыйных рабочых і сялян Кітаю і да новых усягульных узбраеньняў для задушэньня рэвалюцыйнага руху. «Зусім нямысліма,—літаральна заявіў ён, каб народы маглі жыць у парадку і свабодзе да таго часу, пакуль яны знаходзяцца пад нагрозай небясьпечнае звонку і сярэдзіны, невыстарчальна ўзброены абарончымі сродкамі супроць гэтых небясьпек. Нагрозы і небясьпекі неадлучна зьвязаны з антысацыяльнай і антырэлігійнай прапагандзе». (ТАСС)

Жэнэўскія перагаворы толькі абвастрылі супярэчнасьці паміж імпэрыялістамі

ЛІНДАН 28. Буржуазны нядзельны друк у вельмі эмоцыйных тонах характарызуе рэзультаты мінулага году, пазнаходзячы ўцехі ні у адным з бакоў англійскага палітычнага жыцьця. Кансэрватыўная «Обсэрвэр», гаворачы аб нядачы жанэўскіх перагавораў на разбраеньні, заяўляе: «Гэтыя перагаворы толькі дэмэнстрылі і абвастрылі глыбокія супярэчнасьці паміж еўрапейскімі краінамі. Францыя і яе васалы ўтрымлівалі сваю вешную перавагу ў Эўропе ў сілу парыскіх пасьляваенных дагавораў, усе артыкулы якіх абвяшчаюцца сьвяшчэннымі і недатыкальнымі. Між тым, нямецкі народ ніколі ня прымірыцца з такім становішчам. Газэта адзначае, што рыхтуецца другая камбінацыя дзяржаў у процідагу французкай.

Французкі генштаб „працуе"

МАРШАЛ ФРАНШЭ Д'ЭСПЭРЭ Ў АТЭНАХ

АТЭНЫ, 27. Сёньня нібы выпадкова «праездам з Сірыі ў Парыж» сюды прыяжджае французкі маршал Франшэ Д'Эспэрэ, паездка якога ў Сірыю была зьвязана, паводле прызнаньня французкіх улад, з падрыхтоўкай Францыі на «выпадак вайны ва ўсходнім басэйне Міжземнага мора». Ужо вядома, што Франшэ Д'Эспэрэ, які ня раз езьдзіў у апошні час па даручэньні французкага генштабу ў Варшаву і Бухарэст, у Атэнах сустрэнецца з таварышом міністра замежных спраў Катэхакісам, начальнікам генэральнага штабу — Мазарыкісам, інспэктарам грэцкай армії Атанеосам і інш. гэнэралам. Зусім відавочна, што спатканьне прадстаўнікоў генэральных штабаў Францыі і Грэцыі зьвязана з французкімі плянамі падрыхтоўкі вайны і скалачаньня антысавецкага блёку. Тым ня менш, буржуазная преса прабуе гаварыць аб гэтым спатканьні, як аб «знаку» ўвагі і надзеі».

Мытная вайна паміж Чэха-Славакіяй і Вэнгрыяй

ПРАГА, 28. Вэнгерскі ўрад увёў з 20 сьнежня сыстэму ліцэнзій на тавары, якія ўвозяцца з-заграніцы, устанавіўшы адначасова, што усе грузы павінны быць забясьпечаны пасьведчаньнем ад іх пахаджэньні. Гэтыя мерапрыемствы фактычна накіраваны супроць Чэха-Славакіі і зьяўляюцца непасрэдным рэзультатам правалу нядаўніх перагавораў паміж Вэнгрыяй і Чэха-Славакіяй, якія закончыліся поўным разрывам гандлёва-дагаворных адносін. Чэха-славацкі ўрад зьбіраецца адказаць аналёгічнымі контрмерамі. Разрыў гандлёвых зносін з Вэнгрыяй выклікаў вялікі неспакой у колах чэха-славацкіх прамыслоўцаў, а таксама ў прафсаюзных колах, бо стан мытнай вайны паміж абедзьма краінамі азначае далейшае згортваньне прамысловасьці і рост беспрацоўя. Чэхі ўказаць, што ў адной толькі тэкстыльнай прамысловасьці працавала на вэнгерскія заказы, было занята каля 30 тысяч рабочых.

Падвоім пасеўную плошчу свінаводных саўгасаў

Сельска-гаспадарчая кампанія 1931 году будзе першай кампаніяй, якую сьвінаводчыя саўгасы праводзяць у складзе сыстэмы «Сьвінавода».

У выніку кампаніі 1930 г. сабрана больш 15.000 сьвіноматак, у асноўным выкананы плян сельска-гаспадарчых работ. Зараз ідуць вялізарныя будаўнічыя работы.

Пры правядзеньні веснавой сяўбы 1931 г. трэба цьвёрда ўлічваць недахопы, напрыклад (зрыў ўборкі), якія мелі месца ў некаторых саўгасах. Усе гэтыя недахопы зьявіліся вынікам невыстарчальнай мабілізацыі і дамагі пырокай савецкай грамадзкасьці, ігнараваньня спраўы мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў, невыстарчальным рэгуляваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, слабой узаемадапамогі паміж калгасамі і саўгасамі. Вынікі 1930 г. паказваюць і на невыстарчальнасьць самакрытыкі ў часе правядзеньня с.-г. кампаній.

У с.-г. кампанію 1931 г. перад саўгасамі стаіць задача — разьмеркаваць ня менш 50.000 матачнага пагалоўя і ажыцьцявіць у адпаведнасьці з гэтым будаўнічую праграму на суму звыш 10 млн. руб.

«Сьвінавод» павінен арганізаваць дзесятні новых савецкіх гаспадарак і, як мінімум, падвоіць пасеўную плошчу, дабіўшыся стварэньня моцнай кармовай базы для сацыялістычнай сьвінагадоўлі. Грандыёзнасьць гэтае работы вынікае з таго, што с.-г. кампанія ў большай сваёй частцы будзе праводзіцца на новых землях з зусім новымі суадносінамі культур і пры новых запатрабаваньнях да палявой гаспадаркі.

Толькі для пракорму 50.000 сьвіноматак і іх прыплоду трэба правесьці засеў 5.867 га аўса, 4.369 га ячменю, 2.810 га бабовых культур, 7.370 га сена для сьвіней, 1.860 га каранеплодаў, 7.000 га розных зялёных кармоў, а ўсяго звыш 40.000 га.

Вольная тэрыторыя саўгасаў «Сьвінавода» не пазьней 25 сьнежня павінна быць даведзена да 60-65 тысяч га. Невыкананьне гэтага ставіць пад нагрозу скарачэньня праграмы «Сьвінавода», не дазволіць забясьпечыць саўгасы нават грубымі і сакавітымі кармамі.

Пасьпяховае выкананьне задач веснавой сяўбы патрабуе ня толькі складаньня зараз-жа агульнага прамфінплану, але і безадкладнай распрацоўкі канкрэтнага каляндарнага пасеўнага плану.

Сьвінаводчыя саўгасы павінны зразумець неабходнасьць карэннай рэарганізацыі палявой гаспадаркі ў адпаведнасьці з задачамі максымальнай вытворчасьці кармоў, патрэбных для сьвінагадоўлі, неабходнасьці забясьпячэньня максымальных высокіх ураджаяў.

Максымальная шчыльнасьць матачнага пагалоўя патрабуе максымальнай разгрузкі саўгасаў ад непатрэбных спажыўцоў кармавой базы: цялят і коняй.

Коні ў сьвінаводных саўгасах павінны быць заменены трактарамі і аўта-грузавікамі ня менш, чым на 60-65 проц. яшчэ ў 1931 годзе.

У інтарэсах своечасовай падрыхтоўкі трэба не пазьней 15 студзеня скончыць сартаваньне насенных фондаў. Не пазьней 1 лютага павінна быць поўнасьцю скончана рамонтная кампанія, завоз трактараў, прыцэпных машын, мінэральнага ўгнаеньня, насеньня і інш. сродкаў вытворчасьці.

Асабліва адказная задача стаіць перад саўгасамі «Сьвінавода» у галіне мабілізацыі мясцовых угнаеньняў, у пошуку чарту попелу і торфу.

Надыходзячая зіма павінна быць поўнасьцю выкарыстана для арганізацыі і падрыхтоўкі патрэбных кадраў.

Большасьць прарываў, якія былі ў 1930 г., тлумачацца ў значнай меры нетахнікамі арганізацыі працы. Трэба ўжо зараз узяцца за ўкамплектаваньне, падбор рабочых кадраў, за сапраўды сур'ёзную арганізацыю працы.

На вытворчых парадах, на агульных сходах у бліжэйшыя-ж дні трэба распрацоўваць агульны прамфінплян і каляндар яго выкананьня. Адзін з цэнтральных задач саўгасаў зьяўляецца сапраўды шырокая дапамога калгаснага руху, перанясеньне вопыту і перадавога вытворчага дапамога будаўніцтву буйных спэцыялізаваных калектыўных гаспадарак.

Посьпех выкананьня пляну «Сьвінавода» залежыць ад таго, наколькі рабочая маса будзе мабілізавана на барацьбу за выкананьне задач пасеўнай кампаніі, наколькі сапраўды па-ўдарнаму пачнуць працаваць усе зьвяньні «трыкутніка».

Трэба разгарнуць самае шырокае сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ва ўсіх яго новых формах на лепшую своечасовую падрыхтоўку да сяўбы у сьвінаводных саўгасах.

Ніводнага саўгасу, які-б ня прымаў удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве!

Аўчыньнікаў.

НАЗНАЧЭНЬНЕ ТАВ. МЕЖЛАЎКА

МАСКВА, 28. СНК Саюзу ССР назначыў тав. Межлаўка, Івана Іванавіча сакратаром «камісіі выкананьня» пры СНК Саюзу ССР.

КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА У КРАЁХ КАПІТАЛУ

Дэманстрацыя беспрацоўных у Пабіяніцах

Як падае польская буржуазная преса, за апошні толькі месяц лічба беспрацоўных у фашысцкай Польшчы павялічылася на 66.000 чалавек і ўжо зараз на 150.000 чалавек перавышае лічбу беспрацоўных за сьнежань мінулага году. «Робот

Бальшавікі Менску аднадушна ухваляюць

пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)

„Менская арганізацыя—галаўны атрад КП(б)Б—ніколі ня сыдзе з правільных ленінскіх пазыцый, будзе, як і раней, самаахвярна адданы генэральнай лініі партыі, будзе, як і заўсёды, у першых радох змагароў супроць усякіх ухілаў ад ленінскай лініі партыі"

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПЕРШАЙ МЕНСКАЙ ГАРАДЗКОЙ КАНФЭРЭНЦЫІ КП(б)Б ПА ДАКЛАДУ К. В. ГЕЯ АБ ВЫНІКАХ АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМУ ЦК і ЦКК КП(б)Б

Заслухаўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Гея аб выніках аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)**, першая Менская гарадзкая партканфэрэнцыя поўнасьцю ўхваляе і цалкам далучаецца да пастаноў аб'яднанага пленуму.

У барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва, супроць злачынной дзейнасьці шкоднікаў—агентуры францускага імпэрыялізму, які знаходзіцца на чале падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР, ня гледзячы на шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў нашому пераможнаму наступленьню і антыпартыйных выступленьні агентаў кляса-вага ворага ў радох партыі—правых і «левых» апартуністаў,—УсеКП(б) змагла, апіраючыся на вялізарную актыўнасьць рабочае клясы і найшырэйшыя масы батрацтва і бядняцка-серадняцкага сялянства, апіраючыся на сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцкі рух, што ператвараецца ў шодзенны метод усёй нашай работы па будаўніцтве сацыялізму, перавысіць ва ўсіх галінах нашай народнай гаспадаркі на ўсіх асноўных паказальніках намячэньні пяцігадовага плану.

Ужо зараз вытворчасьць сацыялістычнай прамысловасьці больш, чым у два разы, перавышае даваенны ўзровень. Асабліва значнымі былі посьпехі галін прамысловасьці, якія выпускаюць сродкі вытворчасьці. Нашы посьпехі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі дазволілі нам у асноўным ліквідаваць беспрацоўе, перавесьці больш 45 проц. рабочых на 7-гадзінны рабочы дзень і забясьпечыць значнае павышэньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню жыцьця рабочай клясы і ўсіх працоўных СССР. Магутна ўзмацніліся абароназдольнасьць Савецкага Саюзу і ўзмацнілася Чырвоная армія—вартаўнік сацыялістычнага будаўніцтва.

Апіраючыся на посьпехі сацыялістычнай індустрыі, мы забясьпечылі карэнны пералом у бок сацыялістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі: 6 з лішкам мільёнаў сялянскіх двароў, г. зн. больш чым 24 проц. усіх сялянскіх двароў, ахоплена калектывізацыяй, прычым у асноўных збожжавых раёнах гэты процант павышаецца да 50. За першыя два гады пяцігодзі мы пасьпелі ўжо перавысіць у сельскай гаспадарцы ў два разы ўсю пяцігадовую праграму.

Усе гэтыя посьпехі наглядна пацьвярджаюць, што мы пераможна ўступілі ў перыяд сацыялізму.

Вялізарныя посьпехі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва разам з усім Савецкім Саюзам дасягнуты і ў БССР. Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасьці Савецкай Беларусі павялічылася на 74,2 проц. замест вызначанага на другі год пяцігодзі 41 проц. прыросту. БССР пакрылася сеткаю новых сацыялістычных фабрык і заводаў. Значныя посьпехі мы маем у БССР і ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі, які ахапляе 13,2 проц. сялянскіх двароў і 18 проц. усёй пасеўнай плошчы, даў ужо ў гэтым годзе 19,7 проц. усёй валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі і 46,3 проц. усёй таварнай прадукцыі.

Кантрольныя лічбы ставяць перад БССР у галіне сельскай гаспадаркі задачу пераўтварэньня БССР з спажывецкага раёну ў моцную базу жывёлагадоўлі, малочнай гаспадаркі і льнаводзтва.

Гэтыя посьпехі былі дасягнуты таму, што камуністычная партыя — авангард рабочай клясы—згуртаваная вакол свайго ленінскага ЦК і яго кіраўніка т. **Сталіна**, вяла і вядзе рашучую барацьбу на два фронты, здолела разграміць контрэвалюцыйны трацкізм, нанесьці руйнуючы ўдар па правым апартуністам—галоўнай небясьпецы на даным этапе, разьбіць бяспрынцыпныя права-слізацкі блёк Сырцова-Ламанідзе і павесьці рабочую клясу да новых перамог на шляху будаўніцтва сацыялізму.

Жалезнае адзінства партыйных радоў, бязьмежнае давер'е рабочай клясы, найшырэйшых мас батрацтва і бядняцка-серадняцкага сялянства да адзінай партыі пралетарыяту—камуністычнай партыі—і тыя посьпехі, якія ўжо дасягнуты намі, далі магчымасьць ленінскаму ЦК вызначыць на трэці год пяцігодкі гіганцкую задачу. «Выкананьне пляну ў галіне калектывізацыі дасьць абсалютную перавагу сацыялістычным элементам над капіталістычнымі ў вёсцы, змычыць рабочай клясы з працоўнымі масамі сялянства і завершыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР—гэта будзе перамога сусьветна-гістарычнага значэньня».

У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі роля сацыялістычнай прамысловасьці, як вядучага пачатку на ўсёй эканоміцы СССР, яшчэ больш узрасьце. На гэтай аснове будзе забясьпечан яшчэ больш ўздым таго повага прыліву ў калгасы, які зараз маем у вёсцы. Правільнае партыйнае кіраўніцтва, якое забясьпечыла тэмпы нарастаньня калгаснага прыліву, поўнасьцю дае магчымасьць выканаць заданьні аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб ахопе калгасамі ня менш паловы сялянскіх двароў СССР, а таксама заданьне ахапіць ня менш 45 проц. двароў БССР.

Вялізарныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва азначаюць новы незвычайны рост народнага прыбытку, які ўжо ў трэцім годзе пяцігодкі амаль дасягне намячэньня пяцігодкі для 1933 году (49 мільярдаў руб. супроць 40,7 мільярдаў для 1933 году).

Гігантскія задачы, якія пастаўлены аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б), могуць і будуць выкананы толькі пры тэй умове, калі мы яшчэ з большай сілай будзем захоўваць сталёвае адзінства нашай партыі, калі мы жалезнай мятлой будзем і далей ачышчаць нашы рады ад апартуністаў усіх колераў.

Барацьба з правым ухілам—галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» загібамі, з бяспрынцыпным праваслізацкім блёкам, прымірэньцтвам да ўхілаў, барацьба супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму — найбольш небясьпечнага на даным этапе ўхілу ў нацыянальным пытаньні, супроць контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму, які ставіў стаўку на інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу і агентаў нацыянал-дэмакратызму ў радох партыі—нацыянал-апартуністаў (Жылуновіч, Ігнатоўскі і інш. барацьба супроць шавінізму усіх колераў—асноўная ўмова, без якое немагчыма пасьпяховае выкананьне ўсіх задач, якія пастаўлены XVI зьездам УсеКП(б) і апошнім аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Канфэрэнцыя поўнасьцю ўхваляе і лічыць своячасовай пастанову пленуму аб вызваленьні тав. **Рыкава** ад абавязкаў члена Палітбюро і старшыні СНК СССР. Партыя ня можа задаволіцца слоўнымі адмаўленьнямі т. т. Рыкава, Бухарына і інш. од праваапартуністычнай плятформы. Толькі сапраўднае змаганьне за генэральную лінію партыі можа пацьвердзіць гэтыя заявы.

Першая Менская гарадзкая партканфэрэнцыя запэўнае ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, што Менская арганізацыя — галоўны атрад КП(б)Б — ніколі ня сыдзе з правільных ленінскіх пазыцый, будзе, як і раней, **самаахвярна** аддана генэральнай лініі партыі, будзе, як і заўсёды, у першых радох змагароў супроць усякіх ухілаў ад ленінскай лініі партыі. Канфэрэнцыя вітае пастанову ЦК УсеКП(б), які для ўзмацненьня кіруючых органаў савецкай улады вылучыў на пост старшыні СНК СССР загартаванага бальшавіка тав. **Молатава**.

Першая Менская гарадзкая партканфэрэнцыя лічыць абсалютна правільнай тую апэнду, якую даў аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) рабоце Наркамснабу, сыстэме спажывецкай кааперацыі і Цэнтрасаюзу.

Неабходна карэнная перабудова ў адпаведнасьці з патрэбаваньнямі рэканструкцыйнага пэрыяду работы кааперацыйна-загатоўчых органаў, органаў забясьпячэньня, іх паварот тварам да вытворчасьці і ўзмацненьне кіраўніцтва з боку партыйна-савецкіх і прафсаюзных арганізацый работаю кааперацыі і органаў забясьпячэньня. Неабходна забясьпечыць пасьлядоўнае праведзеньне ленінскага прынцыпу ў галіне забясьпячэньня, правільнае размеркаваньне на падставе гэтага прынцыпу налічных таварных фондаў, устанаўленьне сапраўднага кантролю рабочых мас над усёй сыстэмай забясьпячэньня, бязьлітаснае ачышчэньне гэтай сыстэмы ад усіх шкоднікаў клясава-чужых, бюракратычных элементаў і апартуністаў.

Значная перабудова неабходна і ў адносінах форм і мэтадаў работы саветаў. Канфэрэнцыя заклікае Менскую партарганізацыю на аснове пастаноў аб'яднанага пленуму ўзмацніць саветы і ўсю савецкую сыстэму зьверху да ніжу стоікімі, вытрыманымі партыйнымі, разгарнуць вырокую і пасьлядоўную барацьбу з апартуністамі у савецкім апараце. «Перавыбары саветаў павінны ўнесьці карэннае паляпшэньне ў самы склад саветаў. Першае месца ў саветах павінна належаць лепшым ударнікам—у рабочых цэнтрах, перадавым калгаснікам—у вёсцы, як партыйным, так і ня партыйным».

На аснове бальшавіцкага правядзеньня перавыбараў саветаў, на аснове масавага ўцягненьня ў работу саветаў повага актыву ўдарнікаў і калгаснікаў, мы забясьпечым необходную карэнную перабудову работы саветаў, іх сапраўдны паварот тварам да ўдарніцтва, тварам да вытворчасьці, тварам да калгасаў. Канфэрэнцыя падкрэсьлівае, што адной з асноўных задач у рабоце савецкага апарату павінна зьявіцца праверка фактычнага выкананьня пастаноў партыі і ўраду і ўмацненьня дысцыпліны. Дырэктыва пленуму аб ачышчэньні кіруючых савецкіх органаў ад апартуністычных і прымірэнчых элементаў павінна быць цьвёрда і безагаворачна праведзена ў жыцьцё.

У сувязі з пастановамі аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) першая Менская гарадзкая партыйная канфэрэнцыя ставіць перад Менскай партарганізацыяй наступныя канкрэтныя задачы:

1. Адказам на пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) павінна быць яшчэ большая мабілізацыя рабочай клясы на ўдарнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі, яшчэ большае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі, якая зьяўляецца мацнейшай зброяй у змаганьні за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады. Ні адной хвіліны прастою машын. Ні аднаго дня прагулу. Яшчэ большая ўвага якасьці прадукцыі і зьніжэньню сабекошту. Трэба вышэй узьняць сьцяг ударніцтва і сацспаборніцтва. Трэба памножыць рады ўдарнікаў, рады ўдарных брыгад. Пытаньні вытворчага жыцьця павінны заўсёды стаяць у цэнтры ўвагі ўсёй партарганізацыі. Тварам да пэху, да агрэгату, глыбей у рабочыя масы!

Побач з далейшым павышэньнем актыўнасьці працоўных мас, партарганізацыя павінна яшчэ больш накіраваць увагу і сілы пралетарыяту на барацьбу за плян, за паляпшэньне ўсіх паказальнікаў работы сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. У прыватнасьці, трэба поўнасьцю аўладаць пытаньнямі тэхнічнага кіраўніцтва, поўнасьцю скарыстаць унутраныя рэсурсы, разгарнуць рацыяналізацыю, вынаходніцтва і г. д. Самым рашучым чынам трэба выкрываць факты праваапартуністычнай практыкі, барацьба з якімі павінна ўзьнімацца на прынцыповую палітычную вышыню барацьбы за генэральную лінію партыі.

2. Па-бальшавіцку падрыхтавацца да другой калгаснай вясны. Прафсаюзы і шэфскія арганізацыі павінны забясьпечыць узмацненьне пралетарскага кіраўніцтва весьнавой с.-г. кампаніяй, як важнейшай часткай барацьбы за сацыяльную калектывізацыю і ліквідацыю на яе аснове кулацтва, як класы. Мэтад пасылкі рабочых брыгад, які цалкам сябе апраўдаў у сельска-гаспадарчых кампаніях 1930 году, павінен быць шырока скарыстаны ў надыходзячую вясну. Калектывізацыя прыгарадных сельсаветаў над кустом потяду разьвіцьця садова-гародняй гаспадаркі—галавная задача Менскай гарадзкой партарганізацыі.

3. Павінен быць узмоцнен і перабудован ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду апарат МЦРК які павінен зьявіцца апаратам правільнай арганізацыі сацыялістычных форм размеркаваньня.

Апарат МЦРК павінен быць поўнасьцю ачышчан ад шкодніцкіх элементаў.

Неабходна стварыць лепшыя ўмовы для вылучэньня пры якіх было-б забясьпечана ня толькі замацаваньне іх у кааперацыі, але і іх вучоба і прасоўваньне на работе. Пралетарызмы павінны ўзяць шэфства над паасобнымі галінамі работы МЦРК, прафсаюзы павінны забясьпечыць штодзённы і пільны рабочы кантроль над кааперацыяй.

МЦРК павінен ацэньвацца тварам да вытворчасьці, паставіць на належную вышыню зараз у значнай частцы пакуль што нездавальняючую работу закуп і мерамеркавальнікаў, агульнакрэдытных разьмеркавальнікаў, агульнакааперацыйных магазынаў і ўстаноў грамадзкага харчаваньня. У прыватнасьці МЦРК неабходна прыняць рашучыя крокі ў справе забясьпячэньня найшчыкаў дрывамі.

Самакрытыка, ініцыятыва працоўных мас, узмацненьне клясавай пільнасьці, бязьлітасная барацьба з апартуністычнай практыкай павінна быць самым шырокім чынам разгорнута і на гэтым вучастку.

Надыходзячай вясной трэба дабіцца значных посьпехаў у справе ажыцьцяўленьня настаноў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб стымуляваньні правядзеньні ў 25-вёрсным радыюсе вакол прамысловых цэнтраў і выцісканьня з гэтай зоны іншых культур», а таксама шырока разгарнуць будаўніцтва прыгарадных саўгасаў.

4. Надыходзячыя перавыбары Менскага гарсавету павінны быць праведзены Менскай партарганізацыяй так, каб на справе забясьпечыць паварот гарсавету тварам да вытворчасьці, тварам да пэху, каб сапраўды першае месца ў гарсавеце было за ўдарнікамі заводаў, каб гарсавет зрабіць сапраўдным практычным правадніком генэральнай лініі партыі, каб узьняць ролю гарсавету ў правядзеньні на практыцы генэральнай лініі партыі.

5. Канфэрэнцыя абавязвае ўсе партыйныя ячэйкі Менскай арганізацыі забясьпечыць яшчэ большае ўзмацненьне сувязі працоўных з Чырвонай арміяй. Таксама неабходна ўзмацніць увагу да работы ячэек Асавіяхіму.

6. Канфэрэнцыя падкрэсьлівае выключна важнае значаньне палітвучобы, пасьпяховае правядзеньне якое спрыяе справе барацьбы за пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва. Канфэрэнцыя абавязвае ўсе партыйныя ячэйкі Менскай гарадзкой партарганізацыі прыняць усе захады, як у справе забясьпячэньня патрэбных умоў для палітвучобы, так і ўцягненьня ў палітвучобу ўсёй масы партыйцаў.

7. Справа штодзённага інтэрнацыянальнага выхаваньня павінна зьявіцца сустаўною часткаю работы партыйных ячэек. У прыватнасьці неабходна сыстэматычнае азнаямленьне ўсёй партыйнай масы з жмуцём бракіх камуністычных партый, у асаблівасьці з жмуцём кампартыя Заходняя Беларусі і Польшчы.

Няхай жыве ленінскі Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і правадыр партыі тав. Сталін!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАЎ

АБНАВІЦЬ

склад віцебскай гарадзкой выбарчай камісіі, якая правальвае перавыбары гарсавету і ня здолела мабілізаваць рабочыя масы вакол важнейшай палітычнай кампаніі

У барацьбе на два фронты—супроць праваапартуністычнай недаацэнкі перавыбараў і супроць „левых" загібаў, якія льлюць ваду на млын правага апартунізму,—па-бальшавіцку правядзем перавыбары саветаў

Трывожныя сыгналы з Віцебску

Віцебская гарадзкая выбарчая камісія прымае ўдзел у спаборніцтве з Менскам і Гомелем на лепшае праведзеньне перавыбараў саветаў.

Як-жа ў Віцебску праходзіць гэта важнейшая палітычная кампанія?

З дакладу адказнага прадстаўніка Віцебску на пасяджэньні цэнтральнай выбарчай камісіі высьветлілася надзвычай трывожнае стан обшча, больш таго, буйныя прарывы ў ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету.

Дакладчык спачатку паведаміў, што ў горадзе праводзілася шмат падрыхтоўчых нарад сходаў, было скарыстана радыё і самалёты для папулярызацыі кампаніі.

Але лепш за ўсё гаворыць аб якасьці падрыхтоўчай работы сам ход справаздачна-перавыбарчай кампаніі, якая пачалася з 20 сьнежня.

Першы справаздачны сход у будаўнічу сарваўся — зьявілася толькі 70 проц. выбаршчыкаў. У вэтэрынарным інстытуце справаздачны сход сарваўся — зьявілася 50 проц. выбаршчыкаў (гэта ў той час, як на перавыбары сельсаветаў зьяўляецца ў гэтым годзе ад 70 да 80 проц. выбаршчыкаў).

«Віцебскі пралетары» ад 23 сьнежня паведамляе, што на чыгунцы, на заводзе «Прафінтэрн» да кампаніі не падрыхтаваліся, на фабрыцы імя Лекерта нічога ня робіцца да перавыбараў. Грамадзкая думка рабочых на гэтых прадпрыемствах не мабілізавана, наглядна недапушчальныя адносіны да гэтай кампаніі з боку асобных партакалектываў і фабзаўмясцкомаў.

Прафарганізацыі вельмі позна заняліся падрыхтоўкай да кампаніі. Яшчэ горшы ўдзел гаркому камсамолу, які ўпяршыню ўспомніў аб перавыбарах... 4 сьнежня.

Зусім недапушчальным, ярка бюракратычным скажэньнем дырэктыў аб перавыбарах зьяўляецца ўстаноўка віцебскай камісіі на правядзеньне за адзін вечар і справаздачы гарсавету і прыняцьця наказу і выбараў новых дэпутатаў. Як пасьля гэтага можна шырока абмяркоўваць справаздачы, разгортваць самакрытыку? Ды гэта-ж азначае — загадзя сарваць сапраўднае правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету.

Ні лепш характарызуе падрыхтоўку і разуменьне палітычнага значэньня гэтай кампаніі з боку раду віцебскіх органаў наступны факт. Віцебскі гарсавет і выбарчая камісія склалі да перавыбараў пісьмовую справаздачу з усякімі весткамі, лічбамі і г. д., але забыліся падкрэсьліць толькі адно: як гарсавет змагаўся і праводзіў ва ўсёй сваёй рабоце генэральную лінію партыі (па прызначэньні дакладчыка, гэта справаздача была складзена «без палітычных установак»). Добра, што гарком партыі прапанаваў гарсавету замест гэтай дзяліцкай справаздачы склаць тэзісы (дзе напэўна ўжо ўлічаны грубыя палітычныя памылкі гэтай справаздачы).

Як дапамагала гарадзкая выбарчая камісія правядзеньню перавыбараў сельсаветаў у Віцебскім раёне?

Віцебская камісія толькі пасьля атрыманьня прапановы ЦВК па тэлеграфу вызначыла 10 таварышоў, але дагатуль на вёску амаль што ніхто з іх ня выехаў.

Мы ўжо не гаворым аб іншых момантах дакладу віцебскай гарадзкой выбарчай камісіі.

Цэнтральная выбарчая камісія прызнала работу гарадзкой камісіі і становішча справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету нездавальняючымі. ЦВК даў рад указаньняў аб зьяўленьні выяўленых недахопаў і мабілізацыі актыўнасьці рабочых і працоўных мас на безадкладную ліквідацыю прарываў і бадзёрае правядзеньне перавыбараў гарсавету. Цэнтральная камісія паслала ў Віцебск спэцыяльную брыгаду па праверцы і дапамозе перавыбарам гарсавету.

Адпак, такая ацэнка дзейнасьці Віцебскай гарадзкой выбарчай камісіі зьяўляецца далёка ня поўнай.

Даклад аб ходзе перавыбараў у Віцебску сьведчыць аб яўнай **апартуністычнай недаацэнцы кампаніі з боку мясцовых кіруючых органаў і асобных нізавых партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый.** Віцебск павінен быў паказаць для іншых гарадоў узор бальшавіцкага правядзеньня перавыбараў у буйным пралетарскім цэнтры. Віцебскія арганізацыі павінны былі мабілізаваць творчую актыўнасьць мас у часе перавыбараў на барацьбу за лепшыя паказальнікі прамфінпляну і выкананьне іншых гаспадарча-палітычных кампаніяў, на барацьбу за карэнную перабудову работы гарсавету, тварам да вытворчасьці. Усяго гэтага яны пакуль што не дабіліся.

Віцебскія арганізацыі, у першую чаргу, гарком партыі, павінны сказаць па-бальшавіцку разгортваньня кампаніі.

Усё паказанае вышэй гаворыць яшчэ і аб тым, што **цяперашні склад гарадзкой выбарчай камісіі апартуністычна праводзіў важнейшую кампанію і аказаўся няздольным стаць на чале перавыбараў гарсавету. Склад гарадзкой выбарчай камісіі трэба неадкладна абнавіць.**

* * *

Віцебскія ўрокі павінны стаць сыгналам для іншых гарадзкіх выбарчых камісій, у першую чаргу для Менску і Гомелю, якія вядуць спаборніцтва з Віцебскам, але не пацікавіліся праверыць, як там праходзяць перавыбары.

Цэнтральная выбарчая камісія пастанавіла на бліжэйшым сваім пасяджэньні заслухаць **даклады менскай і гомельскай выбарчых камісій, каб высьветліць як гэтыя буйнейшыя пралетарскія цэнтры БССР — удзельнікі сацыялістычнага спаборніцтва з Віцебскам — выконваюць свае абавязацельствы па лепшым правядзеньні перавыбараў саветаў.**

М. Зарніцкі.

Лісты з месц

У Старасельскім сельсавеце, **Копыскага раёну** справаздачна-перавыбарчыя сходы дагэтуль не праведзены, ніякай работы в беднатой не вядзецца. Групы беднаты ў сельсавеце існуюць толькі на паперы (**Гонін**).

* * *

На перавыбары па Танескім 1 Букшанскім сельсаветах, **Тураўскага раёну** зьявіліся 68,5 проц. усіх выбаршчыкаў і 46 проц. жанчын. Недавальняючы процант яўкі тлумачыцца тым, што большасьць позняй была перадана выбаршчыкам за два дні і пават у дзень перавыбараў; ня былі падрыхтаваны памяшканьні для правядзеньня сходаў, не арганізаваны ясьлі для дзяцей; абодны сельсаветы за ўвесь час перавыбараў ні разу не наведаў ні адзін член раённай выбарчай камісіі. На выкананы дырэктыва аб выдуўненьні жанчын у сельсаветы: па Танескім сельсавеце выбрана 18 проц. жанчын, па Букшанскім — 28 проц. (**Брыгадзір Палянскі**).

* * *

Незадавальняюча праходзяць перавыбары на **Пухавіцкім** раёне.

У некаторых сельсаветах процант яўкі не перавышаў 40 проц. Есьць выпадкі непрадуманага рэкамендаваньня кандыдатаў. Напрыклад, у Навасёлкаўскім сельсавеце ў склад кандыдатаў трапілі самагоншчыкі, б. бандыты. У Супінскім польскім нацыянальным сельсавеце ў сьпіс кандыдатаў зусім няма бедняцкай і серадняцкай — палякаў (**Міхась Атава**).

Бязьлітасна біць па рэцыдывах „левых" загібаў

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) канстатаваў, што заданьні пяцігадовага пляну ў галіне калектывізацыі ўжо ў другім годзе аказаліся далёка перавышанымі. На гэтай падставе пленум вызначыў праграму, каб у 1931 годзе скончыць у асноўным калектывізацыю збожжавых раёнаў першай чаргі, давесьці да 50 проц. калектывізацыю сялянскіх гаспадарак у астатніх збожжавых раёнах і да 20 - 25 проц. у раёнах спажываючай палясы.

Гэтыя вялізарныя посьпехі намі дасягнуты дзякуючы няўхільнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі, бязьлітаснай барацьбе з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і «левымі» антысераднякоўскімі загібамі, на падставе захаваньня правільных ленінскіх адносін да серадняка. Толькі на гэтай падставе мы з посьпехам выканаем і перавыканаем бальшавіцкую праграму трэцяга рашаючага году пяцігодкі ў галіне калектывізацыі і на ўсіх іншых галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Паасобныя карэспандэнцыі з месц аб ходзе перавыбараў сельсаветаў сыгналізуюць як аб правых правых практыкі так і аб небясьпецы рэцыдываў, «левых» антысераднякоўскіх загібаў.

Мы атрымалі весткі аб тым, што ў часе перавыбараў **Бабчынскага сельсавету, Хойніцкага раёну,** на агульным сходзе быў прыняты такі наказ новаабранаму сельсавету: «Да вясны 1931 г. у калгасы Бабчынскага сельсавету павінна 100 і «Чырвонаны ўвайсьці: у калгас «Камінтэрн»—140 гаспадарак, «Кастрычнік»—100 і «Чырвоная паляна»—70.

Што азначае гэты наказ?

Наказ Бабчынскага сельсавету зьяўляецца нічым іншым, як простай разьвёрсткай. Наказ, які прымае перавыбарчы сход, зусім, зразумела, зьяўляецца абавязковай дырэктывай для сельсавету.

А ў гэтым наказе катэгарычна прапануецца сельсавету—дабіцца, каб у калгас «Камінтэрн» увайшлі («павінны ўвайсьці»)—140 гаспадарак і г. д.

Каб выканаць гэты наказ, сельсавет павінен ужыць «усе меры»... Замест таго, каб абавязаць сябе правесьці разгорнутую масавую падрыхтоўчую работу па ўцягненьні ў калгасы, прымяняецца разьвёрстка з дакладна вызначанымі лічбамі колькі сямён павінна ўвайсьці ў калгасы, пават—у якія імёны калгасы—замест таго, каб патрабаваць ад калгасаў падрыхтаваць па прынцыпу **новага добраахвотнага** бядняцка-серадняцкага прыліву, прымяняецца ўстаноўка, якая штурхае на адміністраваньне («павінны ўвайсьці»—140 гаспадарак).

Тав. Сталін у вядомым артыкуле «Головокружение от успехов» пісаў, што ў нас **«страшэнна нярэдка пальмяніць падрыхтоўчую** работу па арганізацыі калгасаў чыноўнічым дэкретаваньнем калгаснага руху, папярэднімі рэзалюцыямі аб росьце калгасаў...»

Імённа, па гэтым шляху, які рашуча асуджаны партыяй, пайшло кіраўніцтва Хойніцкага раёну.

Мы патрабуем тэрміновага расьсьледваньня гэтых фактаў і безадкладнага і суровага пакараньня тых, хто імкнецца паўтарыць асуджаныя партыяй «левыя» памылкі, якія дапамагаюць кулацтву і яго агентуры ўнутры партыі—правым ухілістам.

* * *

Мы лічым таксама зусім правільнай і палітычна шкодлівай тую частку наказу, які распрацаваны **Жлобінскім райкомам КП(б)Б**, дзе вызначэна, што ўсе пакаёвы-абраныя сельсаветы павінны дабіцца 50 проц. калектывізацыі да канца 1931 г. Нашы патрэбы даводзіць, што гэткая агульная лічба для ўсіх сельсаветаў ня ўлічвае асаблівасьцяй, кожнага сельсавету паасобку. Прыняцьце такога наказу з вызначэньнем далкладных процантаў для сельсаветаў, ня мінуча стварае спрыяючую глебу для адміністраваньня ў калгасным руху замест правядзеньня шырокай растлумачальнай работы, работы з беднатой, разгортваньня калгаснага будаўніцтва на падставе захаваньня прынцыпаў добраахвотнасьці, і правільных адносін да серадняка. Гэтая фармулёўка ў наказе зьяўляецца таксама адлюстраваньнем «левых» антысераднякоўскіх загібаў.

Зусім зразумела, што разгортваньне калектывізацыі на аснове добраахвотнасьці не азначае стаўкі на самацёк. Партыя дала рашучы адпор гэтай праваапартуністычнай тэорыі. Калгасы пры ліку трэба арганізаваць зьнізу, шляхам мабілізацыі бядняцка-серадняцкіх мас, а таксама калгаснага актыву. Але на спробах пальмяніць масавую растлумачальна-прапагандысцкую работу—крымам, загадам, адміністраваньнем—трэба моцна біць.

Разгортваньне калгаснага руху партыя будзе ажыцьцяўляць, кіруючыся пастановамі XVI зьезду УсеКП(б): «Калгасы могуць быць пабудаваны на аснове добраахвотнасьці. Усякая спроба ўжываньня гвалту ці адміністрацыйнага прымусу ў адносінах бядняцка-серадняцкіх мас у гэтых іх далучэньня да калектыву зьяўляецца грубым парушэньнем лініі партыі і злоўжываньнем уладаў».

Толькі кіруючыся гэтымі дырэктывамі, мы выканаем пяцігодку за чатыры гады, пераўтворым БССР да канца пяцігодкі у краіну суцэльнай калектывізацыі, і на гэтай падставе ліквідуем кулацтва, як класу—гэту апошнюю апору капіталістычнай эксплёатацыі ў нашай краіне.

М. З.

АШЧАДКАСЫ—

баявы вучастак мабілізацыі сродкаў

Поўным выкананьнем фінплану пад скорым пераможнае наступленьне сацыялізму

Камсамол—шэф ашчадапарату

ВІЦЕБСК. (Наш. кар.). Камсамол Віцебшчыны ўзяў шэфства над ашчадкасамі. Дзесяць лепшых ударнікаў-камсамольцаў вылучаны на работу ў апарат ашчадкас. Арганізаваны камсамольскія брыгады з 100 чалавек, якія прымацаваны да асобных прадпрыемстваў і устаноў для правядзеньня шэфскай растлумачальнай работы аб мабілізацыі сродкаў.

Група камсамольцаў выехала на вёску для работы па ашчадсправе.

У бліжэйшы час у горадзе адкрыецца камсамольскае аддзяленьне ашчадкасы. На заводзе «Мэдпром» на камсамольскім сходзе праведзена дадатковая падпісна на пазыку, якая дала 3.700 рублёў.

Камсамольскі калектыў вэтэрынарнага інстытуту поўнасьцю ўступіў у ашчадкасы.

Гарадзкі камітэт камсамолу праводзіць кампанію пад лёзунгам — КОЖНЫ КАМСАМОЛЕЦ ПАВІНЕН МАБІЛІЗАВАЦЬ НЯ МЕНШ ТРОХ УКЛАДЧЫКАЎ АШЧАДКАС.

ШЛ.

Ашчадкасы гор. Менску пазделелі выканаць кантрольнага заданьня

Вынікі работы менскіх гарадзкіх ашчадных кас за асобны квартал кастрычнік-сьнежань НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫЯ. Кантрольныя лічбы — уцягнуць 15.000 рублёў новых укладаў, — не выканана, бясьць нават адліў у 12.000 руб. На 20 сьнежня ўцягнута 3.000 новых укладчыкаў замест 4.500, пасьля кантрольных лічбаў. Безнаяўных вкладчыкаў ужываецца ня больш паасобных кантрольнага заданьня.

Прыходзіцца адзначыць, што менскія грамадзкія арганізацыі не аддаюць увагі мабілізацыі сродкаў праз ашчадкасы. Па гор. Менску мы ня маем выпадку, калі-б ФЗМК, альбо камісіі садзейнасьці паставілі на сваім пасяджэньні справаздачу аб рабоце ашчадкасы, якая абслугоўвае калектыў прадпрыемства, або установы. Наадварот, работнікам ашчадкасы часта з вялікімі трудкасьцямі ўдаецца дабіцца ўключэньня ў парадак дня сходу пытаньня мабілізацыі сродкаў.

Калі дадаць, што работнікі ашчадкасы не зрабілі ўсяго магчымага, каб выканаць дырэктывы партыі і ўраду аб мабілізацыі сродкаў, дык станецца зразумелымі прычыны прарываў у работе ашчадкас.

Ашчадкасы Менску атрымалі кантрольныя лічбы на першы квартал 1931 г. Яны складаюць 330.000 рублёў укладаў і 8.300 укладчыкаў. Лічбы даведзены да паасобных кас. Зараз трэба давесьці іх да прадпрыемстваў і устаноў, абгаварыць кантрольныя лічбы на пасяджэньнях грамадзкіх арганізацый і агульных рабочых сходах.

Кавіц.

Ахапіць сацыялістычным сэктар вёскі

На адным з апошніх пасяджэньняў цэнтральная камісія садзейнасьці дзяцям прадыту заслухала даклад галоўнага кіраўніцтва ашчадкасамі аб мабілізацыі вольных сродкаў насельніцтва.

Цэнтральная камісія прызнала, што сыстэма ашчадкас ня выканала заданьня асобнага кварталу, што прарывы ва ўцягненьні сродкаў на сельскім ня ліквідаваны.

За час з 1-га кастрычніка па 1-е сьнежня прыліў укладаў складае толькі 149.000 рублёў — або 4.5 проц. квартальнага заданьня. Уцягнута за гэты час 26.000 укладчыкаў — менш пяцёх кантрольнай лічбы. Камісія падкрэсьліла наяўнасьць адліву укладаў на гарадох (453.000 руб.).

Нагадваецца значны розьніца аформленай у ашчадкасах падпіскі на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» і паступленьнем чарговых узносаў. Вельмі слаба разьвіты безнаяўныя разьлікі па масавых плацяжох прадпрыемстваў: у радзе гарадоў безнаяўныя разьлікі зусім ня ўжываюцца, у Слаўгарадзе, Шаравічах праведзена толькі 11 апэрацый, у Мар'інаву — 40, па Оршы — 53.

Вельмі слаба працуе ашчадны аддзел на вёсцы, амаль зусім бязьдзейнічае паштовая сетка ашчадкас.

Цэнтральная камісія садзейнасьці прызнала, што нізавыя камсолы, фінапарат і ашчадкасы ня прычынілі мер, каб мабілізаваць грамадзкасьць вакол пытаньня мабілізацыі сродкаў.

Цэнтральная камісія прапанавала кіраўніцтву ашчадкасамі неадкладна арганізаваць работу ашчадкас і ліквідаваць ўдарных тэмпаў работы.

Кантрольныя лічбы 1931 г. павінны быць даведзены да кожнага прадпрыемства, да кожнага заводу, установы, сельсавету, калгасу, саўгасу.

Кіраўніцтву ашчадкасамі даручана забясьпечыць у бліжэйшы час ліквідацыю запазычанасьці па падпісцы на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады».

Пры пашырэньні нізавой сеткі ашчадкас трэба зьвярнуць галоўную

КОЖНАЙ УДАРНАЙ БРЫГАДЗЕ—РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІ МІНІМУМ

Сьледуйце прыкладу перадавых фабрык і заводаў, якія скончылі датэрмінова свае прамфінпляны

МІЛЬЕНЫ ПАД СПУДАМ

Мабілізуйце ўнутраныя рэсурсы для перамогі трэцяга году пяцігодкі

Залежы

У МІЛЬЁНЫ РУБЛЕЎ

НА МНОГІХ ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ **ВІЦЕБСКУ** МАБІЛІЗАЦЫІ ЎНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ АДДАЕЦЦА ЗУСІМ МАЛА ЎВАГІ. ЗРОБЛЕНЫ НЯДАЎНА НАЛЕТ НА ПААСОБНЫЯ ФАБРЫКІ ВЫЯВІЎ ВЯЛІКУЮ КОЛЬКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ, ЯКАЯ ЛЯЖЫЦЬ БЯЗ РУХУ. МІЛЬЁНЫ РУБЛЕЎ ЛЯЖАЦЬ МЁРТВЫМ КАПІТАЛАМ. ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЯ ПРЫМАЮЦЬ НАЛЕЖНЫХ МЕР ДА СКАНЧЭНЬНЯ ГЭТАЙ ПРАДУКЦЫІ І ПЕРАДАЧЫ ЯЕ КААПЕРАЦЫІ.

На **панчошнай фабрыцы імя Кпары Цэткін скапілася каля 30.000 дзесяткаў** пар нясканчаных панчох, запасы растуць з кожным днём. Аспоўная прычына гэтага—пераспарадчасьць апарату. Машыны, якія абпыроўваюць панчохі, працуюць з перабоямі і несваячасова рамантуюцца. Выніку **250.000 руб.** ляжаць мёртвым капіталам.

На шавейных фабрыках **«Прафінтэрн»** выяўлены вялікія залежы нясканчаных штаноў і паліто. У цэху па шыўцы штаноў фабрыкі «Прафінтэрн» а-на несваячасовата рамонту машын, скапілася **40.000 нясканчаных штаноў.** На гэтай-жа прычыне на фабрыцы «Прафінтэрн» № 3 скапілася нясканчаных **6.000 паліто.**

На абутковай фабрыцы імя Лекерта з прычыны дрэннага плянаваньня і няўвязкі працы цэхаў ёсьць каля **30 000 пар нясканчанага абутку.**

Пры недахваце прамтавараў, які мы зараз адчуваем, скапленьне вялізнай колькасьці нясканчаных паўфабрыкатаў зьяўляецца простым злачынствам. У гэту сытуацыю павінны зараз-жа ўмешацца РСІ і пракуратура.

Ф.

Рэкорды браку

Гомельскі завод імя Ланцуцкага выканаў настрычніцкую праграму на 42 проц., з пастандаўскую на 43 проц. (уключаючы нясканчаную прадукцыю). Чым тлумачыць такі прарыў? Кіраўнікі заводу тлумачаць прарыў пераробкамі ў забясьпечаньні сырцом. Але апрача таго трэба сказаць, што на заводзе адчуваецца значнае паспабленьне кіраўніцтва і заняпад працдысцыпліны. Адны толькі прагулы на нягрунтоўных прычынах складаюць у кастрычніку 14 ПРОЦ. АГУЛЬНАЙ КОЛЬКАСЬЦІ РАБОЧЫХ. Процант браку даходзіць да небачаных разьмераў. Каваль МЯСХАНОВІЧ атрымаў нарад на выраб 100 стоек для рэпінаў. З гэтых 100 стоек—71 АКАЗАЛАСЯ БРАКОЎНАЙ, прычым перавыдатак матэлаю супроць нормы складае 50 кілёграм. Каваль БЕЛАСТОЦКАМУ дано было заданьне зрабіць 300 кубікаў для замацаваньня трэсаў. У выніку з 200—160 БРАКОЎНЫХ. Гэты-ж самы БЕЛАСТОЦКІ павінен быў зрабіць 24 бакі для рамен. УСЕ 24 АКАЗАЛІСЯ БРАКОЎНЫМІ.

Рабочы ВАЙЦЭХОЎСКІ паказаў рэкорд злачынных адносін да работы, прасраўшы 430 БРАКОЎНЫХ БАЛТОЎ З 500.

Гэта толькі некалькі характэрных фактаў, а падобных—шмат. Гэта даводзіць у якім становішчы знаходзіцца тэхнічны нагляд і працдысцыпліна. Няхай кіраўнікі заводу зараз дакажуць, што вялізарны прарыў тлумачыцца выключна недахватам сырцу.

15 сьнежня ў сувязі з аглядам па ўсіх цэхах створаны брыгады па ліквідацыі прарыву і вызначэньні мер для паляпшэньня якасьці прадукцыі. 16 сьнежня выходзіць спэцыяльны нумар заводскай шматтыражкі, прысьвечаны агляду. На заводскіх арганізацыях пляжыць вялікая адказнасьць за добрае напаўненьне агляду, які ў выніку ПАВІНЕН ПРЫВЕСЬЦІ ДА ЗРУХУ Ў РАБОЦЕ.

ВЫНАХОДЗТВА

ВАЛЯЕЦЦА ПАД ЗАЎКОМАЎСКІМ СТАЛОМ

Яшчэ ў красавіку 1930 г. рабочы-вылучэнец віцебскай інструментальна-мэблевай фабрыкі **Ісьянаў** вынайшаў варштат для фанэроўкі дэталей мэблі. Гэтае вынаходзтва было праверана механікам Ленінградскім і інжынэрам Спарскім, якія цалкам яго ўхвалілі і пастанавілі адпраўіць праект варштату ў Ленінград для ацэнкі. Ва ўмовах фабрыкі гэты варштат дае вялікую эканомію. Так, пры рабоце ўручную 20 шт. дэталей абыходзіцца ў 4 руб., пры механізацыі-ж 450 шт. каштавалі 8 руб.

Але да гэтага часу мадэль варштату валяецца ў фабкоме пад сталом і ніякіх мер ня ўжываюць, каб ажыцьвіць гэта вынаходзтва. Трэба зараз-жа прыцягнуць да адказнасьці тлушыцелаў рабочай ініцыятывы.

М'ркін.

Рацыяналізацыя

з'эканоміла рабочую сілу

Бюро рацыяналізацыі гуты імя **Домбаля** наладзіла надвесную дарогу ад шліфярні да складу гатовых вырабаў. Ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства дае скарачэньне рабочых, занятых на вазоньсцы прадукцыі. Але загадчык складу ў увесь час супрацьдзеяцца ажыцьцяўленьню гэтага мерапрыемства. Дырэктар некалькі раз даваў распараджэньні аб скарачэньні лішніх людзей. Загадчык-жа складу ня выконваў гэтых распараджэньняў.

У часе агляду гэта пытаньне зноў было паставлена. Зараз замест 6 чал. ніша былі заняты раней, спраўляюцца два.

ФЭЙТ.

На 360.000 руб. прадукцыі

СКАПІЛАСЯ НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ ДОМБАЛЯ

Імпартнае абсталяваньне —пад сьнегам

На заводзе **«Домбаля»** (Н.-Барысаў) па складзе скапілася **на 360.000 руб. гатовай прадукцыі.**

На 275.000 гэтай прадукцыі закуплена Саюзшклофэрфарам, але на працягу 4-х месяцаў гэту прадукцыю ніхто не забірае.

Гатунковага і лямпавага шкла, на якое зараз ёсьць вялікі попыт, **на складзе скапілася на 110.000 руб.**

З 1925 г. на заводзе ляжаць **хрустальныя лямпы на 10.000 р., шампанскія шклянкі на 15.000 р. і лямпы-ручнікі—на 5.000 руб.**

Завод мае больш чым на год запасу паперы.

На дварэ фабрыкі валяецца шмат лому, катлы, якія маглі-б быць скарыстаны Рудмэталягандлем. Ня гледзячы на рад указаньняў з боку камісіі па мабілізацыі сродкаў аб рэалізацыі гэтай прадукцыі, заводаўпраўніцтва ня прымае ніякіх мер.

На фабрыках **«Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога»** выяўлена звыш чым **на 40.000 р. усякіх мэханічных інструмантаў,** зусім непатрэбных фабрыкам. Вярблюжыя рэмні, якія так неабходны на іншых прадпрыемствах, на заводзе ляжаць бяз усякага руху. Запасу паперы на фабрыках ёсьць звыш чым на 8 месяцаў, а кіраўнікі аб гэтым нават і ня ведалі.

Больш двух вагонаў суперфасфату, які так патрэбен калгасам і саўгасам, ляжыць бяз руху.

Імпартнае абсталяваньне, якое каштуе звыш 30.000 руб. золатам, валяецца на дварэ пад сьнегам, або на складзе і не скарыстоўваецца. Электраабсталяваньне, якое будзе патрэбна толькі праз год, таксама ляжыць нескарыстаным.

Выяўлен склад, напоўнены жалезам, якое нікім не скарыстоўваецца.

БАРЫСАЎСКІ.

Вялікія прастоі на „Чырвонай Бярэзіне"

БАРЫСАЎ, 29. (Па тэлефону ад наш. кар.). З-за нядбайных адносін адміністрацыі фабрык «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога», якая не забясьпечыла нармальнай работы парнікоў (несваячасовая падача пары, рамонт труб), парнікі не паспяваюць падаваць патрэбную колькасьць капод. З-за адсутнасьці распараных капод 28-га сьнежня фабрыка «Чырвоная Бярэзіна» мела прастою 8 ГАДЗІН, «Пралетарская перамога» — 4 ГАДЗ. Па гэтай-жа прычыне 29-га сьнежня ф-кі «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» мелі 2-ХГАДЗ. ПРАСТОЙ. У момант перадачы гэтай інфармацыі стаіць другая вымена.

Пракуратура павінна заняцца гэтым пытаньнем і прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у перабойнай рабоце ф-к.

41 прапакова ня выканана

а тэрмін даўно прашоў

На заводзе «Чырвоны Кастрычнік» створана адна агульна-заводзкая брыгада і 3 цэхавыя. Завод пачаў агляд з валіцім спазьненьнем—20 сьнежня. Першыя-ж вылазкі брыгад выявілі шмат недахопаў і недалёў. Цэхам не хапае варштатаў—такарнага, шліфавальнага і даўбежнага. Няма шыкі для ангельскіх шпілек, не хапае кваліфікаванай сілы, не хапае дроту.

Несваячасова выконваюцца рабочыя прапановы. З 1-га верасьня 1930 г. паступіла 114 рабочых прапаноў. З іх прыняты 72, адхілены 42, выкананы 31, ня выканана **41 прапанова.** З апошніх—34 прапановы павінны былі быць выкананы да гэтага часу—**тэрмін выканаўня даўно прайшоў.**

Аглядавыя брыгады арганізавалі мітынг рабочых, склікалі нараду заводзкіх арганізацый і тыдзень вытворчых нарадаў для ліквідацыі прарыву ў 6,5 проц. Камсамольскі калектыў абвясьціў сябе ўдарным на ліквідацыі прарыву. Кіраўніцтва з боку падтклектыву і заўкому аглядавымі брыгадамі невыстарчальнае.

М.сюра.

Мартэны чакаюць лому

БССР адгрузіла толькі 76 проц. заданьня

На многіх прадпрыемствах недаацэньваюць значэньня збору лому

Ударны квартал падыходзіць к канцу. Між тым, заданьне па зборы мэталялому выкананае па БССР у разьмеры **75,9 проц. Сабрана ўсяго 7.598,6 тон. На першым месцы па зборы лому ідуць Менск, Магілёў і Віцебск.** Значна адстаюць Гомель, Бабруйск.

Лісты рабкораў за апошнія дні сьведчаць, што на многіх прадпрыемствах збору мэталялому не аддаецца належнай увагі, ня гледзячы на тое, што збор мэталялому зьяўляецца адным з мерапрыемстваў па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Так, **т. К. Ф.** з Рэчыцы паведамляе, што на фабрыках **«Дняпро» і «Х Кастрычнік»** яшчэ 14 сьнежня быў арганізаваны суботнік па зборы лому. Але-ж увесь лом свячасова не адпраўлены. Частка яго зараз засыпана сьнегам.

Вылучаная камісія для праверкі запасаў на складах дагэтуль нічога ня робіць. Між тым, пры актыўнасьці заводзкіх арганізацый можна было-б сабраць і адгрузіць Рудмэталягандлю каля **15 тон мэталялому.**

Прадстаўнік Рудмэталягандлю Махроў вельмі нядбайна адносіцца да сваёй работы. Ужо тры месяцы на заводзе ляжаць 9 тон лому, вызначаныя для Рудмэталягандлю. Махроў аб гэтым ведае, але лому не забірае.

Тав. **Стэрнін** паведамляе, што на фабрыцы **«Чырвоная зорка»** (Чашнікі) сабрана каля 50 тон лому, але ніхто не пакланапіўся, каб гэты лом адгрузіць новым мэталюргічным прадпрыемствам.

На барысаўскай электрастанцыі, — ніша рабкор **Іваноў,** — валяецца больш за **30 тон мэталялому.** Ні заводаўпраўніцтва, ні грамадзкія арганізацыі нічога не зрабілі для своечасовага збору яго.

На **гомельскіх прадпрыемствах** яўна недаацэньваюць значэньня збору мэталялому. На фабрыцы **«Вэзувій»** накапілася каля **200 тон лому.** На чыгунцы яго таксама ня менш, але лом не адгружаецца. На многіх прадпрыемствах ён ужо засыпан сьнегам.

На фабрыцы **«Пралетарская перамога»** камсамольская арганізацыя сабрала 10 тон мэталялому і перадала Рудмэталягандлю. На заводзе **«Зьвязда»** (Капычы) сабраны мэталялом ужо адгружаны Рудмэталягандлю.

Збор лому на вёсцы ідзе сусім незадавальняюча. Спажывецкая кааперацыя ня выканала свайго заданьня. У Капыльскім раёне, — як паведамляе селькор Сяткіч, — збор лому забыты вучастак работы. Ні камсамол, ні прафсаюзныя арганізацыі апрача настаноў нічога не зрабілі. Прафсаюзы лічаць, што гэта ня іх справа.

Прамфінплян да варштату не даведзен

«Дняпроўская мануфактура» вядома сваім хранічным невыкананьнем прамфінпляну. Фабрычныя бюракраты мабілізуюць усе сілы на... **падшуканьне «аб'ектыўных прычын».** Складаюцца цэлыя тэорыі: аб уплыве марозаў на вытворчасьць, аб недахваце вільгаці ў цэхах і г. д. Сапраўдныя-ж прычыны ляжаць у дрэнным кіраўніцтве і ў падзеях на самацёк—«можа вывезе». **Прамфінплян яшчэ не даведзен ні да паасобнага варштату, ні да паасобнага камплекту, ні да вытворчага калектыву ў цэлым.** Зразумела, што ніякага кантролю за вытворчасьцю ў цэху няма. Зводкі па выкананьні прамфінпляну складаюцца агульныя па фабрыцы адзін раз за 10 дзён, а на працягу гэтага часу працуюць усьляпую.

У першую дзесяцідзёнку сьнежня некаторыя вытворчыя калектывы, ня ведаючы вынікаў сваёй штодзённай працы, вылучылі **свайго «статыстыка»,** які падлічваў штодзённы выраб. Лічбы паказвалі рост—115, 120, 125 проц. нормаў. Частка рабочых гэтых калектываў парашыла, што пры такіх «посьпехах» можна і «з імбрычкам павазіцца і гарбаткі папіць». А к канцу дзесяцідзёнкі ў канторы падлічылі—**82 проц. выканаўня.** Зноў шуканьне «аб'ектыўных прычын», зноў «тэорыі», пасяджэньні, а **прамфінпляны да варштату так і застаецца не даведзеным.** Таксама ня ведаюць аб выніках сваёй работы ўдарнікі, якія кабілізаваліся на ліквідацыю прарыву.

Толькі ў пачатку другой дзесяцідзёнкі і фабрычныя арганізацыі разгарнулі некаторую масавую работу, што адразу-ж павялічыла выкананьне праграмы да 93 проц. Для ліквідацыі прарыву трэба было за апошнюю дзесяцідзёнку выканаць праграму **на 110 проц.** Шырокія варштаты, якія далі 85-90 проц. заданьня, а асабліва вузкія варштаты, якія даюць 40-45 проц. заданьня, павінны падтягнуцца, узяць прыклад з вытворчых калектываў пры «Нартропах», якія далі 25,5 проц. звыш плянавых заданьняў у параўнаньні з першай дзесяцідзёнкай.

На фабрыцы зараз працуюць **агляда выя брыгады разам з «лёгкай кавалерыяй»** на выяўленьні прычын прагулаў. У праверку ўключыліся рабкораўскія пасты. Сталовая пераведзена на трохзьменную работу.

Ці будзе ліквідаваны прарыў—пакажа трэцяя дзесяцідзёнка.

В. Ф.

Рабочыя—вынаходцы

не атрымліваюць дапамогі

Каштоўныя адкіды не скарыстоўваюцца

На заводзе **«Чырвоны мэталіст»** (Віцебск) рабочыя—вынаходцы не атрымліваюць дапамогі з боку заводакіраўніцтва і заводзкіх арганізацый. Рабочыя заводу яшчэ памятаюць геніяльні супроць вынаходцы **Дудкова,** які быў перакінут на чорную работу толькі за тое, што адважыўся гаварыць, што ён унёс шмат новага ў работу заводу. Усе яшчэ памятаюць, як за каштоўнае вынаходзтва яму выдалі прэмію ў... 7 руб. Між тым, Дудкоў адзіны ў горадзе спэцыяліст па штампах і шаблёнах.

Вынаходца **т. Ласінскі** на зьлёце ўдарнікаў быў вылучан у рацыяналізатары заводу. З вялікім запалам ён узяўся за гэту работу, але з першых-жа крокаў сустрэў бюракратычныя адносіны і спасылаўшы на розныя «аб'ектыўныя прычыны». Даволі паказаць, што з 45 яго каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў **праведзена ў жыцьцё толькі 8.**

Абвешчаны шматтыражкай **«Мэтпромавець»** збор рабочых прапаноў узарушыў усю рабочую масу заводу. Паступіла шмат новых каштоўных прапаноў, якія былі надрукаваны ў газэце. Ня гледзячы на тое, што з таго часу прайшло больш за 2 месяцы, гэтыя прапановы не праводзяцца ў жыцьцё. Прэміяльны фонд скарыстаны ўсяго толькі на 25 проц.

Вышэйпаданыя факты гавораць аб тым, як адносіцца заводзкія арганізацыі да рабочага вынаходзтва і як працуе бюро рацыяналізацыі.

А. ПАПІШ.

* * *

За апошні час на заводзе значна павялічыліся ўнутрызаводзкія выдаткі, асабліва разбухлі штаты абслугоўваючага персаналу. Так, у кузьні і ў плужным цэху зараз ёсьць 14 чал. адміністрацыйнага персаналу. У самым заводакіраўніцтве мы маем 6 дырэктараў. Здавалася-б, што пры такім павялічаным штаце павінна была паленшыцца работа ў цэхах. На справе-ж мы назіраем павялічэньне браку, пагаршэньне якасьці прадукцыі і заняпад працоўнай дысцыпліны.

Аб гэтым амаль у кожным нумары шматтыражкі сыгналізуюць рабкоры на шага заводу. Усё гэта тлумачыцца досадкамасьцю кантрольнага апарату. Для прыкладу можна прывесьці такі факт, калі з 60 плугоў з вагону было выбракована 27 шт., а гэтыя-ж плугі былі прывезены дзе адпраўкі.

АЗЭРБУХ.

Генэральны агляд прамысловасьці выявіў, што на віцебскім заводзе «Чырвоны мэталіст» вельмі слаба скарыстоўваюцца унутраныя рэсурсы. Так абрэзкі ад адпалаў могуць быць скарыстаны для вырабу шайбаў для плуга ДТЛРМ. Пры рэзцы адпалаў да ачучэнкаў заставаецца вялікія кавалкі, якія таксама могуць быць скарыстаны, але чамусьці гэтыя абрэзкі напраўляюцца на цагельні.

На заводзе ёсьць шмат дышлаў ад старых марак плугоў. Яны могуць быць скарыстаны для вырабу частак для плугоў ДТЛРМ. Некаторыя адкіды можна скарыстаць для вырабу хамуцінаў для плугоў ДТЛРМ, але заводзкая адміністрацыя і заводзкія арганізацыі амаль нічога не зрабілі для мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў на заводзе. Ва ўмовах-жа «Чырвонага мэталіста» гэта мае асаблівае значэньне, бо завод адчувае нястачу ў мэтале.

ГАЎРЫЛЬЧЫК.

Вынікі кепскай падрыхтоўкі

ВЫКАНАНЬНЕ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ АДКЛАДЗЕНА НА СТУДЗЕНЬ

Завод **«Камінтэрн»** у Н.-Барысаве увесь 1929-30 г. знаходзіўся на чырвонай дошцы, як завод, які добра выконвае прамфінпляны. Але ў сувязі з **кепскай падрыхтоўкай да ўдарнага квартылу, слабой прапрацоўкай адозвы ЦК УсеКП(б) і невыстарчальнай мабілізацыяй мас,** тэмпы работы значна панізіліся і далі толькі 60-70 проц. праграмы.

У канцы кастрычніка заводзкі пачаў рыхтавацца да вытворчых манэўраў. Рыхтаваліся да 5-га сьнежня. Ня гледзячы на такі вялікі тэрмін, фанэрны майстар **Мардовіч** заявіў, што ён яшчэ не гатоў. Вытворчыя манэўры ўсё-ж пачаліся. Яны паказалі, што **прамфінпляны рэальны** і што пры напружаньні энэргіі рабочага калектыву можна дабіцца патрэбных вынікаў. Калі да вытворчых манэўраў праграма лесапільнага цэху была выканана на 83 проц., **дык за час вытворчых манэўраў праграма была выканана на 104,15 проц.** Толькі **фанэрны цэх** замест 79 проц. даў 61 проц. выканаўня праграмы.

Пасьля-ж вытворчых манэўраў **усё кіраўніцтва заводу парашыла адпачыць.** На другі-ж дзень выкананьне праграмы пачало зьніжацца і на 22 сьнежня дасягнула на фанэрным цэху 45,49 проц., а на лесапільным — 60,45 проц. Такім чынам, заводзкія арганізацыі ня здолелі замацаваць дасягнутых вынікаў. Адміністрацыя не пакланацілася падрыхтаваць патрэбную колькасьць сухога апалу, ня ўжыла адпаведных мер для своечасовай падачы сырцу і адсартаваньня яго. З 29 кантоўных рабочых прапаноў выканана толькі **адна, а выкананьне іншых адкладзена на студзень.** Такія тэмпы работы адміністрацыі адбіліся на настроях ударнікаў і мелі ўплыў на вытворчасьць. Апрача таго адміністрацыя не прыняла рашучых мер для забясьпячэньня рабочых зімовай спэцвопратакай, што выклікае шмат прагулаў.

СЬВЯРДЗЕЛАК.

Хто зрывае прамфінплян?

Лесапільна-бачарны завод «ПРАЦА» (ст. Старушкі, Зах. чыг.) перададзены Пастепоўскім леспрамгасам Іньпапяньковаўніцтвам. Пры перадачы ўмовіліся, што ўсе ялёнкі паступаюць леспрамгасу, а эпошні павінен забясьпечыць рабочых бачарнага цэху спэцвопраткай, сам-жа цэх — усімі патрэбнымі тэхнічнымі матар'яламі.

Што-ж мы бачым? СПЭЦВОПРАТКІ РАБОЧЫЯ НЕ АТРЫМАЛІ. З надыходам марозаў частка рабочых робіць прымушаныя прагулы з-за адсутнасьці вапёнак, а тыя рабочыя, якія прыходзяць, замест рэзкі, скачуць ля варштатаў «чачотку», бо стаяць на адным месцы 8 гадзін у ботах у халодным памяшканьні немагчыма.

Ня лепш справа стаіць з забясьпячэньнем тэхнічнымі матар'яламі. Напрыклад, НАПІЛЬНІКАЎ ДЛЯ ВАСТРЭНЬНЯ ПІЛ У ЦЭХУ НЯМА (на складзе леспрамгасу яны ЕСЬЦЬ). Прыходзіцца замест вастрэньня піл рабіць «шліфоўку» старымі напільнікамі.

Пасьля перадачы заводу, дырэктар леспрамгасу т. РЭЙДЭР адлаў загад прывезьці асабіста яму 12 вазоў дроў. Дровы былі яму прывезены. А тое, што заводу не хапае апалу, яго ня цікавіць.

М—скі.

Рвацтву, падрадчым мэтадам працы ня можа быць месца на савецкай фабрыцы

У нумары «Зьвязды» ад 28-га сьнежня мы адзначалі аб асобных вытворчых дасягненьнях віцебскай акулярнай фабрыкі. Сёньня мы падрабязна спынімся на асобных буйных недахопах работы партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыі фабрыкі, перашкаджаючых яе нармальнай рабоце. Асобныя памылкі, дапушчаныя фабрычнымі арганізацыямі, маюць палітычнае значэньне і павінны паслужыць урокам для іншых.

Прафработа на фабрыцы пастаўлена вельмі кепска. Да гэтага часу цэхкамітэты існуюць на паперы. Культработа зусім не адчуваецца. З 1.400 рабочых, працуючых на фабрыцы, каля 700 зьяўляюцца ўдарнікамі. Але ўдарныя брыгадамі ніхто ня кіруе. Цяжка адрозьніць дзе працуе ўдарнік і дзе няўдарнік. Зусім адсутнічае ўлік сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Лепшыя прыклады работы ўдарнікаў не пераносяцца на другія цэхі і брыгады.

Па ініцыятыве кіраўніцтва фабрыкі, з дазволу кіраўнікоў партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыі, на фабрыцы была арганізавана брыгада, якая назвала сябе «ударнай сацыялістычнай брыгадай штампоўшчыц», у брыгаду ўступіла каля 60 чал. Брыгада заключыла «соцдагавор» з кіраўніцтвам ф-кі на наступных умовах. Брыгада бярэ на сябе абавязак даць паўную колькасьць поўфабрыкату, за што адміністрацыя абавязваецца выплаціць брыгадзе за 2 месяцы 15.000 рубл. У пункце 8-м запісана так:

«У выпадку парушэньня з боку кіраўніцтва фабрыкі, выкліканага аб'ектыўнымі прычынамі, несваячасовай падачы сырцу і інш., за брыгадай захоўваецца палажэньне аб вымушаных прагулах, прадугледжаных агульнай калумовай на ф-цы».

Аб сацыялістычна-ударных мэтадах і формах работы ў гэтай умове няма ніводнага пункту.

Брыгада пачала праводзіць свае «параўнкі». Існуючыя расрады рабочых былі скасаваны, заработак устанаўліваўся спэцыяльна выбранай «лянёркай». У брыгаду ўвайшлі нават пасобныя камуністы і камсамольцы, якія страцілі клясавую чуласьць і ня ўлічылі шкодлівасьці заключанага дагавору. Камуністы **Бараўноў і Нарцышка** нават увайшлі ў кіруючую лянёрку, устанавіўшы сабе месяц.

Фабрычныя арганізацыі лічаць гэта нармальным зьявішчам.

Праўда, зараз віцебскі гарком партыі прыняў рад рашучых мер да аздараўленьня прафэсыянальна-партыйных арганізацый ф-кі. Правапартыйныя «трыкутнікі» абноўлены.

Зараз ф-ка рыхтуецца да 3-га рашаючага году пяцігодкі. Кантрольныя лічбы прадугледжваюць рост валавой прадукцыі на 200 проц., рост рабочага калектыву на 1.000 чал. супроць 1929-30 гаспадарчага году.

Ф.

ВЕСТКІ ПЕРАМОГІ

„КАМУНАР", ФАБРЫКА ІМЯ ВАРОЎСКАГА, ГУТА ІМЯ ДОМБАЛЯ, ЛІЦЕЙНЫ ЦЭХ ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА СКОНЧЫЛІ ДАТЭРМІНОВА ПРАМФІНПЛЯН УДАРНАГА

„Камунар" скончыў праграму

МЕНСКІ ЗАВОД «КАМУНАР» 29-га СЬНЕЖНЯ У 4 ГАДЗ. ДНЯ ВЫКАНАЎ ПРАМФІНПЛЯН УДАРНАГА КВАРТАЛУ, ВЫПУСЬЦІЎШЫ ПРАДУКЦЫІ НА 1.296.000 РУБ. ЗАМЕСТ 1.294.000 РУБ. ПА СУСТРЭЧНЫМ ПРАМФІНПЛЯНЕ.

УЧОРА Ў ЦЭХАХ АДБЫЛІСЯ МІТЫНГІ, ПРЫСЬВЕЧАНЫЯ ДАТЭРМІНОВАМУ ВЫКАНАНЬНЮ ПРАМФІНПЛЯНУ. У СВАІХ РЭЗАЛЮЦЫЯХ РАБОЧЫЯ «КАМУНАРА» АБЯЦАЮЦЬ І Ў 1931 ГОДЗЕ ТАКСАМА БІЦЦА З ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ, ЦВЁРДА ПРАВОДЗІЦЬ У ЖЫЦЬЦЁ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ.

ГУРЗАЧ.

Ліцейны цэх заводу імя Ланцуцкага

давёў рэалькасьць прамфінпляну

ГОМЕЛЬ, 28. (Нат кар.). НА ФОНЕ АГУЛЬНАГА ПРАРЫВУ НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА, ЛІЦЕЙНЫ ЦЭХ ДАВЁЎ РЭАЛЬНАСЬЦЬ ПРАМФІНПЛЯНУ АСОБНАГА КВАРТАЛУ. ПЛЯН НА СЕНЕЖНІ ДЗЕНЬ ПЕРАВЫКОНАН. ЗАМЕСТ ЛІЦЬЦЯ ДЛЯ 300 РАСТВОРАМЯШАЛАК АДЛІТА ЛІЦЬЦЯ НА 450 РАСТВОРАМЯШАЛАК. ЗАМЕСТ 21 КАМНЯДРАБІЛКІ АДЛІТА 1 ЗАМЕСТ 60 ВАГОНАЎ АДЛІТА 64.

ЗА АПОШНІ КВАРТАЛ 1929-30 Г. ЛІЦЕЙНЫ ЦЭХ ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА ВЫПУСЬЦІЎ 404 ТОНЫ ЛІЦЬЦЯ. А ЗА ЎДАРНЫ КВАРТАЛ — 600 ТОН. ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ ЎЗЬНЯЛАСЯ НА 28 ПРОЦ.

Гута імя Домбаля выканала прамфінплян

НОВА-БАРЫСАЎ, 29. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШ. КАР.). ГУТА ІМЯ ДОМБАЛЯ, ЯКАЯ Ў ПАЧАТКУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ МЕЛА ВЯЛІКІ ПРАРЫЎ І БЫЛА ЗЬНЯТА НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР ГАЗЭТАЙ «ЗЬВЯЗДА», 27-Е СЬНЕЖНЯ, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА 36 ГАДЗІН ПРАСТОЮ 23 і 24 СЬНЕЖНЯ З ПРЫЧЫНЫ НЕДАХВАТУ СОДЫ, **ВЫКАНАЛА ПРАМФІНПЛЯН УДАРНАГА КВАРТАЛУ НА 101,87 ПРОЦ.**

28 СЬНЕЖНЯ ГУТА ІМЯ ДОМБАЛЯ ПРЫСТУПІЛА **ДА ЛІКВІДАЦЫІ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ** ДРУГОГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ, ЯКАЯ СКЛАДАЕ 6,4 ПРОЦ. ПРАГРАМЫ.

Ф-ка імя Вароўскага

на першым месцы сярод кардонных фабрык

Кардонная фабрыка ІМЯ ВАРОЎСКАГА Ў СУРАЖЫ была высунута арэзмыдумам ЦСПСБ у ліч першых пандыдатаў на Усесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства. Сапраўды, праграму 1929-30 г. фабрыка перавыканала на 11 проц. і зьнізіла сабекошт на 19,5 проц. замест 16 проц. паводле плану.

Праграма ўдарнага кварталу ў параўнаньні з першым кварталам 1929-30 г. была павялічана НА 3½ ПРОЦ.

У кастрычніку месяцы на фабрыцы былі праведзены ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ. У выніку праграма па кастрычніку была выканана на 101,8 проц. Ад рабочых паступіла 57 ПРАПАНОЎ, з якіх 30 УЖО ВЫКАНАНЫ. 60 рабочых з 85, што працуюць на фабрыцы, далі замацаваязацельства — не пакідаць фабрыку да канца пяцігодкі. За час вытворчых манэўраў дасягнута значная эканомія ў выдаткаваньні апалу. Замест 56 КУБАМЭТРАЎ дроў у сутні выдаткавалася ў сярэднім 45 КУБАМЭТРАЎ.

Зараз на падставе дасягненьня ўкладзен сустрэчны прамфінплян, які паслужыў кантрольным лічбам яшчэ на 3 проц.

У лістападзе месячнае заданьне было недавыканана на 5,8 проц. Але, дзякуючы ўпартай рабоце рабочага калектыву і фабрычных арганізацыяў, 16-га СЬНЕЖНЯ прарыў быў цалкам ліквідаваны, а за апошнюю пяцідзёнку мы маем нават перавыкананьне пляну на 1,5 проц.

19-га сьнежня фабрыка ўключана ў агляд прамысловасьці, арганізаваны «Зьвяздой». Рабочыя выкананы на сацспаборніцтва кардонную фабрыку імя Леніна — на лепшае правядзеньне агляду і выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу. Апрача гэтага, рабочыя фабрыкі парашылі ўзяць фабрыку імя Леніна на ГРАМАДЗКІ БУКСІР і дапамагчы ёй ліквідаваць прарыў.

ДРЭЙЗІН, РАЦЦЭНКА.

„Вузкае месца" на „Гомсельмашы"

ГОМЕЛЬ, 28. (Наш кар.). Аглядавая брыгада на «Гомсельмашы» канстатавала, што ў прарыве вінаваты аборны цэх, які да гэтага часу яшчэ цьвёрда ня вызначыў мэтадаў сваёй работы. Да гэтага часу ідуць спрэчкі: устанавіць сыстэму патоку (накшталт канвэеру, які ахапляе ўсіх рабочых цэху) ці працаваць брыгадным мэтадам. Аглядавая брыгада прышла да высновы, што паток — добры мэтад, адкуль, на «Гомсельмашы», дзе ня ўсе машыны ўстаноўлены, вельмі цяжка рэгуляваць работу патоку. Таму аглядавая брыгада выказваецца за неадкладную арганізацыю БРЫГАДНЫХ МЭТАДАЎ работы Ў ДАПАМОГУ ПАТОКУ. Гэтым будзе ліквідавана «вузкае месца» аборнага цэху. Прымаючы пад увагу, што ЛІЦЕЙНЫ ЦЭХ можа выпускаць патрэбную колькасьць дэталей ДЛЯ 100 ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ, трэба чакаць паляпшэньня ў рабоце заводу.

Торф—„Чырвонай Бярэзіне"

Адміністрацыя торфазаводу „Чырвоны Кастрычнік" зрываэ праграму запалкавых фабрык

Раённыя арганізацыі абмяжоўваюцца спачуваньнямі

За 12 кілёмэтраў ад Барысава знаходзіцца тарфяны завод **«Чырвоны Кастрычнік»,** які забясьпечвае апалам электрастанцыю імя Леніна пры фабрыках «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» і гуту імя Домбаля. У першы-ж год сваёй работы завод «Чырвоны Кастрычнік» не даваў гэтым фабрыкам 10.000 тон апалу. Але, дзякуючы таму, што электрастанцыя пачала работу пазьней вызначанага тэрміну, апалу хапіла на 5 месяцаў.

Пачынаючы з ліпеня 1930 году, электрастанцыя ў сувязі з адсутнасьцю торфу павінна апальваць свае катлы дровамі. Топкі ўжо год працуюць без рамонту і на працягу апошніх 6-ці месяцаў вельмі часта выходзяць са строю.

У жніўні адміністрацыя фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» заключыла дагавор з Белторфам на дастаўку 17 тыс. тон торфу. Паводле дагавору пачатак завозу торфу вызначан на 15 лістапада. **Але да гэтага часу торфазавод ня прывёз яшчэ ні аднаго кілёграма.**

Рабочая брыгада, пасланая на торфазавод фабр

Па Савецкай Беларусі

Падрыхтоўка жывёлаводаў для калгасаў

ЖЛОБІН. (Наш кар.). У Жлобіне арганізаваны навучарамонтныя курсы па падрыхтоўцы жывёлагадоўчых кадраў для калгасаў. Курсы разлічаны на 70 чалавек.

Тэхніка-эк курсы арганізуюцца яшчэ ў чырэх пунктах рэйну і прапусцяць каля 300 чалавек.

Тавары—спажыўцу

ДРЫБІНСІ. (Наш кар.). Дрыбінскі райспажывсаюз арганізаваў 4 брыгады для кантролю за прасоўваннем тавараў ад прамысловасьці да канцэрацыйнай сеткі і ад канцэрацыі да спажыўца. У брыгады вылучаны лепшыя рабочыя-гарэлкі.

Калгасы ў дапамогу лесазагатоўкам

Беззаказ-цэнтр прапанаваў усім райсаўгасам прыняць самыя рашучыя меры для поўнага скарыстання вольнай абсекі і пачаваў сілы калгасаў на лесазагатоўчых і лесанарэзачных работах.

Райсаўгасаюзы павінны весьці шырокую растлумачальную работу сярод калгаснікаў аб іх удзеле ў лесазагатоўках. Кіраўнікі калгасаў, якія беспадстаўна адмаўляюцца ад удзелу ў лесазагатоўках, прыцягваюцца да адказнасьці.

Раённыя зьезды саветаў

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанавіў з 15 студзеня да 10 лютага 1931 году правесьці раённыя зьезды саветаў. Вызначаны тэрміны і парадак скліканьня зьезд даў. 15 студзеня будуць скліканы зьезды па 30 раёнах, 25 студзеня—па 26 раёнах, 30 студзеня—па 22 раёнах і 5 лютага—па 22 раёнах.

Прэзыдыум ЦВК рэкамэндаваў раённым выканаўчым камітэтам наступны парадак дня зьездаў: даклад ураду БССР; справаздача райвыканкому; перспэктывы культурнага і гаспадарчага будаўніцтва і зацвярджэньне бюджэту на 1931 год; аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі і падрыхтоўцы да чарговай весьнавой пасеўнай кампаніі; выбары райвыканкому; выбары на X-ты ўсебеларускі зьезд саветаў. Прэзыдыум адзначыў, што пры абгаварэньні першых трох пунктаў асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на пытаньні ўсеагульнага навучаньня і культурнага будаўніцтва.

Кампанія—пад пагрозай зрыву

СТАРАСЕЛЬЛЕ. (Наш кар.). Перавыбары ў Старасельскім сельсавеце (Копыскі р-н) яшчэ не пачаліся. Справаздачныя сходы не праводзяцца. Ніякай растлумачальнай работы сярод беднаты, калгаснікаў не вядзецца. Групы беднаты пры сельсавеце не працуюць. Пры гэтакіх тэмпах работы перавыбары па сельсавеце, бязумоўна, будуць сарваны.

СКАСАВАНЫ ПЕРАВЫБАРЫ СЕЛЬСАВЕТУ

ТУРАЎ. (Наш кар.). Раённая выбарчая камісія скасавала перавыбары на двух вучастках Тапескага сельсавету. Прычыны: жанчын выбрана толькі 14 проц. агульнага ліку членаў сельсавету; позвы яўрэйскаму праўпаму насельніцтву зусім не перададзены.

Палянскі.

Бюрократа Нікіціна заклікаць да парадку

Патрэбна ўмяшаньне пракуратуры

11 сьнежня ў Менск прыехаў адказны работнік Цэнтрасаюзу тав. **Сераброў** на ўдзелу ў рабоце па мабілізацыі сродкаў. Тав. Сераброў спыніўся ў цэнтральнай гасьцініцы (б. Эўропа).

Усім зразумела, якое важнае значэньне мае работа па мабілізацыі сродкаў. Тав. Сераброў павінен быў спаткаць спакойную садзейнасьць і дапамогу ў выкананьні сваіх абавязкаў. Аднак, зусім шчыра кажучы, прытрымліваецца загадчык центральнай гасьцініцы **Нікіціна**, невядома, па якіх прычынах апошні адмовіў выдаць тав. Сераброва з пакоя. 24 сьнежня ўночы, калі тав. Сераброў вярнуўся з нарады ЦСПСБ, ён знайшоў на стале запіску Нікіціна, у якой апошні патрабаваў асвабаваньня пакоя.

25 сьнежня, калі тав. Сераброў найшоў на работу, Нікіцін распарадзіўся вынесьці яго рэчы ў кантору і заняць пакой.

Усе довады тав. Сераброва аб тым, што яму патрэбен пакой, што наводзе загаду з центру ён павінен яшчэ працаваць у Менску, — на Нікіціна не грабілі ўплыву.

— У нас няма месца, — бюракратычна заявіў ён — ідзеце, куды хочаце.

Не дапамагла таксама і адносіна кіраўніка справаў СНК. Нікіцін упарта не жадае даць тав. Сераброву пакой у гасьцініцы.

Да гэтага часу тав. Сераброў яго мае прытулку, між тым ён павінен яшчэ значны час працаваць у Менску.

Мы лічым паводзіны загадчыка гасьцініцы Нікіціна подапушчальна-бюракратычнымі, у той час, калі ў гасьцініцы знаходзяць прытулак розныя прыезджыя гастралёры, для якіх работнікаў з центру месца няма. Пракуратура павінна зацікавіцца гэтай справай.

Г. Б.

Першы выпуск вячэрняга рабочага тэхнікуму

Ужо больш чатырох год існуе ў Менску вячэрні рабочы механічна-будаўнічы тэхнікум.

У першыя гады гэты тэхнікум на меў той папулярнасьці, якою ён карыстаецца зараз сярод рабочых фабрык і заводаў Менску.

Апошнія два гады былі нераломнымі ў рабоце тэхнікуму. Тэхнікум сапраўды павярнуўся тварам да вытворчасьці.

Сьлета ў лік студэнтаў было прынята звыш 300 рабочых.

На жаль, гаспадарчыя і прафесіянальныя арганізацыі мала цікавяцца работай тэхнікуму. Даводзі паказаць на такі факт, што на пасяджэньне савету тэхнікуму, прысьвечанае выпуску, прафсаюзы, Белбудаб'яднаньне, Белжылсаюз і Лесбел паваг ня лічылі патрэбным прысылаць сваіх прадстаўнікоў.

30 сьнежня вячэрні рабочы тэхнікум выпускае 21 чалавека, 12 тэхнікаў-будаўнікоў і 9 тэхнікаў-механікаў. Гэты выпуск—сьляга ня толькі для тэхнікуму, але і для ўсіх працоўных Менску.

Усе выпускнікі працяглі вытворчую практыку на пабудовах, фабрыках і заводах. Большасьць з іх працавала на адказнай рабоце ў якасьці прарабаў і тэхнікаў. Паводле даведак спэцыялістаў і кіраўнікоў гаспадарчых устаноў выпускнікі апраўдалі сябе на вытворчасьці.

Апрача тэхнічнай работы выпускнікі былі начальнікамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на прадпрыемствах.

Многія выпускнікі ў часе сваёй практыкі атрымалі премі за мерапрыемствы па рацыяналізацыі.

Трэба спадзявацца, што выпускнікі будуць з гонарам насіць імя пралетарскіх спэцыялістаў і з усёй вытрымасьцю панясуць свае веды, на бытыя ў тэхнікуме, на рыштаваньні сацыялістычнай будоўлі.

Маладым пралетарскім тэхнікам першага выпуску—шчырае прывітаньне!

В. Ю.

Новы корпус абутковай фабрыкі

З пускам новых цэхаў фабрыка будзе вырабляць 12.000 пар абутку ў суткі

У пачатку лютага 1931 году будзе скончана пабудова новага корпусу менскай фабрыкі абутку. Пабудова, разам з санітарна-тэхнічнымі мерапрыемствамі, будзе каштаваць звыш мільёна руб.

У новым корпусе фабрыкі будуць зьмяшчацца тры цэхі. Унутранае абсталяваньне цэхаў пераважна вырабляе на савецкіх заводах.

Зараз фабрыка пры поўнай нагрузцы выпускае 4.000 пар абутку ў суткі. З пускам новых цэхаў фабрыка будзе вырабляць 12.000 пар. Такім чынам, валавая вытвор'цоўка фабрыкі павялічыцца на 300 проц.

Памяці тав. ЛІПЕЦА

21 сьнежня на 70 годзе жыцьця памёр старэйшы падпольшчык - бальшавік, галаровы член Беларускага камітэту саюзу мэталістаў, тав. **Ліпец.**

Тав. Ліпец з самага ранняга ўзросту прымае актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху. У 1879 г. ён прадаваў у гуртку народавольцаў, куды завербаваў шмат рабочых. У 1885 г. тав. Ліпец быў арыштаваны Варшаўскай паліцыяй за ўдзел у рэвалюцыйным гуртку. Пасьля трохмесячнага зьняволеньня ў Варшаўскай турме тав. Ліпец пераязджае ў Пецярбург, потым у Вільню. Там ён зноў трапіў у турму за рэвалюцыйную дзейнасьць, дзе прасядзеў адзін месяц. З Вільні тав. Ліпец пераехаў у Лёндан, працягваў там пяць месяцаў і вярнуўся ў Менск, дзе паступіў на працу ў майстэрні МВБ чыгункі. Тут ён разгортвае падпольную работу. Яго кватэра заўсёды служыла для канспіраціўных сходаў і працы падпольных гурткоў.

У 1897 г. тав. Ліпец арганізаваў у Менску нелегальны саюз мэталістаў і рэвалюцыйны гурток «Іскравец». У 1902 г. ён прымае актыўны ўдзел у забастоўках майстэрань МВБ чыгункі.

У 1903 г. тав. Ліпец уступае ў рады РСДРП—бальшавікоў.

У 1905 г. тав. Ліпец прымае ўдзел ва ўсерасійскай забастоўцы і кіруе рабочым рухам на прадпрыемствах Менску.

У сьнежні ён быў арыштаваны жандармэрыяй. Пасьля вызваленьня ён уходзіць у падполье.

Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі тав. Ліпец зноў пачынае актыўную рэвалюцыйную дзейнасьць. У 1918 г. у часе нямецкай акупацыі працуе на падпольнай рабоце, у часе польскай акупацыі ўяжджае ў Воршу.

Пасьля вызваленьня Беларусі ад беларускай акупацыі тав. Ліпец прымае актыўны ўдзел у рабоце саюзу мэталістаў. Да апошняга часу ён быў галаровым членам Беларускага Камітэту гэтага саюзу.

Рабочая клясе Менску, асабліва мэталістам, будуць доўга памятаць гэтага стойкага бальшавіка, лепшага барацьбіта за перамогу сацыялізму.

Прэзыдыум Беларускага камітэту саюзу мэталістаў.

МЕНСК

Польска-беларускі слоўнік

Польсэктар БАН'у разам з інстытутам мовазнаўства прыступілі да складаньня польска - беларускага слоўніка. Ужо зданы ў друк сповы першых літараў альфабэту. Поўнасьцю слоўнік будзе зданы ў друк да 1 кніўня 1931 году і будзе налічваць 60.000 слоў.

Пабудова дому зямляробства

Калегія Наркамзему БССР пастанавіла пабудаваць у 1931 г. у Менску дом зямляробства. У доме будуць зьмяшчацца: трэст «Сьвіпавод», насенгрэст, малочна-гародны і малочна-масьлены трэсты, галоўленком, Белсельсаб, Электрасельбуд, Белкалгасбуд, упаўнаважны трэсту мінэральных угнаеньняў і Беладдзяленьне ўсесаюзнага т-ва на барацьбе з эпізоотыяй. Для пабудовы дому зямляробства вызначан вучастак на рагу Савецкай і Нова-Вабруйскай вуліц. Будаўніцтва дому даручана Белдзяржбуду.

Вывазку дроў—на баявыя тэмпы

Апалавая камісія пры гарсавеце пастанавіла з 27 сьнежня 1930 году ўвесьці для сельскага насельніцтва пры гарадзкай мяжы калгаснікаў і саўгаснікаў платную гужавінаасьць па вывазцы дроў. Камісія абавязала прыгарадны сельсавет кожны дзень даваць для вывазкі дроў 400 фурманак. Трансэрэст і арцель «Чырвоны транспартнік» павінны кожны дзень даваць па 50 фурманак.

Павялічэньне вырабу тормасоў

Прэзыдыум ВСНГБ пастанавіў павялічыць выраб тормасоў на віцебскім заводзе «Чырвоны мэталіст». У 1931 годзе завод павінен выпусьціць 8.000 тормасоў. Белгасснабу запрапанавана забясьпечыць завод патрэбнай колькасьцю волакна. Тормасы цэх пераводзіцца на 2-хзьмэнную работу.

Выканаць дырэктыву ЦКК-НК РСІ

У свой час ЦКК-НК РСІ даў дырэктыву ўсім РКК - РСІ і мясцовым менскіх устаноў праверыць выкананьне кантрэсу на 1929-30 год. Праверка павінна была быць скончана не пазьней 15 сьнежня бягучага году. Аднак, да гэтага часу амаль ні адна РКК-РСІ і ні адзін мясцовы ня прысылалі ў ЦКК-НК РСІ вынікаў праверкі.

У сувязі з гэтым ЦКК-НК РСІ прапанавала ўсім гарадзкім і раённым КК-РСІ неадкладна закончыць праверку і выслаць вынікі яе не пазьней, чым праз 5 дзён.

ЦПСБ даручана высьвятліць прычыны невыкананьня мясцовымі менскіх устаноў дырэктыў ЦКК—НК РСІ і прапанаваць ім пасюрыць прысылку, вынікаў праверкі.

ЗА ДЗЕНЬ

— Цэнтральны саюз Асоавіяхіму БССР у бліжэйшы час адкрывае ў Віцебску першую ў БССР школу грамадзянскай авіяцыі.

Гарсавет прызнаў неадвальнаючай работу на мабілізацыі сродкаў. Прэзыдыум прапанаваў гарфа да 1-га студзеня ліквідаваць усю запазычанасьць па падатках і самаабкладаньні, а таксама ўзмацніць рэалізацыю пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады».

— Пры віцебскім гарсавеце Асоавіяхіму працуюць курсы па падрыхтоўцы матарыстаў-авіятараў. Першы выпуск курсаў адбудзецца 1-га красавіка 1931 году.

— У 1931 годзе пры літаратурна-лінгвістычным аддзяленьні падфаку БДУ будзе арганізавана **сэкцыя літаратурна-выдавецкіх кадраў.** Сэкцыя будзе складацца з 2 груп: літаратурнай творчасьці і крытыкі і літаратурна-выдавецкая. У сэкцыю будзе прынята 50 чал.: 40—на беларускае аддзяленьне і 20 — на яўрэйскае.

„Дзень дырыжабля" ў БССР

У другой палове студзеня 1931 году ў БССР будзе праводзіцца «дзень дырыжабля». ЦС Асоавіяхіму прапанаваў усім арганізацыям Асоавіяхіму БССР сваячасова пачаць падрыхтоўку да гэта га дня.

Лепшым ударнікам—месцы на курортах

Беларускае курортнае бюро вызначыла 70 месц на зімовыя курорты для прэміраваньня ўдарнікаў. ЦСПСБ і НП саюзаў разьмеркавалі гэтыя месцы паміж фабзаўкомамі. Апошнія павінны былі забраніраваць месцы за лепшымі ўдарнікамі не пазьней 27-га сьнежня. Між тым, па сёньняшні дзень з усіх 70 месц забраніравана толькі... 6.

Такія адносіны з боку ФЗМК да прэміраваньня ўдарнікаў недапушчальны.

Ліст у рэдакцыю

У сваім артыкуле «Аграрная палітыка беларускай Кандрацьцеўшчыны», зьмешчаным у «Зьвязьдзе» 3-XI, у адносінах было адзначана, што прыцэпаўскі плян праф. Вэйсман раіць для студэнтаў; пасьля гэтага я атрымаў даведку, якую лічу патрэбным падрукаваць.

Г. БОНДАР.

Спраўка

Дадзена гэта праф. **І. А. Вайсману** ў тым, што ў праграмах, маючыхся ў дакладзе на курсу «Эканоміка сельскае гаспадаркі» за 1928-29 і 29-30 г. ня рэкамэндаваліся ў якасьці падручнікаў «Перспэктыўны плян развіцьця сельскае і лясное гаспадаркі БССР на 1925-1927—1929-30 г.» і «Матар'ялы к пяцігадоваму пляну народнае гаспадаркі БССР на 1927-28—1931-32 г. г.».

Сакратар Наркамзему НІЗАЎЦОЎ.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— Дом Пісьменьніка. У 19 гадз. — агульны сход пісьменьнікаў г. Менску. З прычыны важнасьці пытаньняў, просьба да ўсіх пісьменьнікаў зьявіцца свайчасова.

— Наркам БДУ. У 17 гадз., у аўд. 317 гал. корп. БДУ — адкрытае пасяджэньне катэдры палітэканоміі ф-ту наркаму, сумесна з навуковымі работнікамі і студэнтамі факультэту. У парадку дня: «Варожыя ўплывы ў навуковых работах выкладчыкаў ф-ту наркаму». Запрашаюцца ўсе навуковыя работнікі і студэнты.

— Клюб навуковых працаўнікоў. У 20 з пал. гадз. — канцэрт, прысьвечаны «тыдню беларускай пралетарскай культуры». Прымаюць удзел: Бел. дзяржаўная капэла, сімфанічны ансамбль і інш. Уваход на членскіх білетах сэкцыі.

— Пэдгабінэт. У 19 гадз. — чарговыя заняткі выкладчыкаў мовазнаўства.

ЗАЎТРА:

— Пэдгабінэт. У 19 гадз., у залі Дому Асьветы — агульны сход асьветнікаў па абгаварэньні сумесна з штабамі культэстафэты і вытворчых мачэўраў паняродных вынікаў вытворчых культманяўраў і конкурсу на лепшую культасьветную ўстанову.

— Вайсковы габінэт. Роўна ў 9 гадз. ран. — збор студэнтаў БДУ і хімікатэхналёгічнага інстытуту: першым курсам — у актавай залі хім.-тэхн. ін-ту, 2-3 курсы — у акт. залі гал. корп. БДУ. Паходу ў поле ня будзе. Студэнты-служачыя ад яўкі вызваляюцца. Яўка для астатніх абавязкова. Рэгістрацыя на курсах акадэм. працаўнікамі.

— Мэдінстытут. У 9 гадз. ран. збор для студэнтаў мэдінстытуту ўсіх курсаў — у анатам. корп. Студэнты-служачыя ад яўкі вызваляюцца.

— БАН. У 11 гадз. ран., у гал. корп. — пасяджэньне сэмінару асьпірантаў-літаратараў па мэтадалёгіі літаратуры. Асьпіранты-партыйцы і камсамольцы павінны ўзяць на вучот яч. КП(б)Б і ЛКСМБ БАН да 1-га студзеня. Тэхсакратары яч. КП(б)Б і ЛКСМБ дзяжурыць 30, 31 сьнежня і 1 студзеня 31 г. ад 2—4 г. у нашай мясцовым.

— Дом Асьветы. У 19 гадз. — вечар, прысьвечаны паняродным выпікам культ маняўраў. Пасьля сходу — мастацкая частка. Уваход па разданых білетах.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар . 13-80 | Начны рэдактар . 6-41
Сакратар . 10-74 | Галоўная кантора 7-31
Сакратар інфармацыі . . 6-13 | Аддзел падпіскі . 7-31
абвесткі . 7-31

Умовы падпіскі (з дарожным дадаткам „Прафрух")

На 1 мес. . . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . . 2 р. 80 к.
„ 6 мес. . . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . . 9 р. 75 к.

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншага гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьлядоўнасьць тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. 64-рэцца 10 проц. надбавку.

Абвесткі прымаюцца ў сал. канторы газэты „ЗЬВЯЗДА" Менск. Савецкая, 63, 2-га паверх, тэл. 7-31.

1-га студзеня 1931 г., у 7 г. веч., у пам. Дому Працасьветы адкрываецца

ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ ПАРТЫЙНА - КАМСАМОЛЬСКАЯ І ПРАФСАЮЗНАЯ НАРАДА,

па пытаньні дзіцячага камуністычнага руху, з наступным парадкам дня:

1) Даклад аб становішчы ДКА Беларусі (ЦК ЛКСМБ—Гайдукевіч).
2) Даклад ураду аб ўдзеле дзяцей у сац. будаўніцтве і суладзь ПКА аб работе ў школе (ЦВК, НКА).
3) Даклад аб работе прафсаюзаў сярод дзяцей (ЦСПСБ).

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі ад фабрык і заводаў, працуючых устаноў і інш.

Выбраныя дэлегаты павінны зьявіцца за атрыманьнем мандатаў у ЦК ЛКСМБ 1-га студзеня з 10 да 4 гадз. дня.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Адкрыты спэктакль

ПЕРШАЯ КОННАЯ

ПАЧАТАК РОУНА ў 8 гадз. веч.

Білеты—ў касу тэатру.

Кіно-тэатр ШЧАСЬЛІВЫ КЕНТ

дзіва ў 6 частках.

Кіно „Пальмира" ПАЭТА І ЦАР

Гістарычны раман

Кіно „Пальмира" БЕСТЭР КІТОН

у лепш. замежным фільме

З ЭПОХІ З

Кіно „Новы Піянэр" МАЛПА-ПАВІЯН

Дзіцячы фільм ў адзін сэанс.

Кіно „Гартак" НАТЭЛА

драма ў 7 частках.

Куплены прафтэхшколай агітэтрывалага будаўніцтва спэктакль

— „ПЕРШАЯ КОННАЯ" —

на 30 сьнежня ПЕРАНОСІЦЦА НА 3 СТУДЗЕНЯ.

Усе білеты сапраўдны на 3 студзеня.

У аўдыторыі, 30 сьнежня, у 7 гадз. веч., у пам. рэдакцыі часопісі «БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА» (Энгельса, 28, гак. 12, б. Акругкам) адбудзецца

агульна-гарадзкая нарада рабкораў.

Парадак дня: 1) Аб задачах 3-га году пяцігодкі. 2) Аб праверцы работы дзіцячых сходаў у горадзе.

Яўка ўсіх рабкораў абавязкова. Запрашаюцца таксама рабкоры насьпенгазэт і шматтыражак.

30 сьнежня у 8 гадз., у Доме Пісьменьніка,—

ВЕЧАР ДЗІЦЯЧАЙ КНІГІ.

Чарговыя пытаньні беларускай дзіцячай літаратуры.

Вынікі ўсебеларускага конкурсу на дзіцячую кнігу ўсапрыцьцо канкэрэтаў прэміраваных твораў.

Выступаць прадстаўнікі БДВ. НКА, праф. Панкевіч, Пісьменьнікі і інш.

Запрашаюцца: настаўнікі, піянэрскія работнікі, бібліятэкары, прадстаўнікі культарганізацый.

Кошт публікацыі аб згуе і дакументу 1 р.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Сёньня і штодзенна

2-я і АПОШНЯЯ СЭРЫЯ 2-я

амэрыканскай карціны

1. БЯЗБОЖНІЦА

у 6 частках.

2. Гукавы фільм у 2-х частках.

САРАКАВЫ МАЙ

Пачатак сэансаў а 6, 7 з пал., 9, 10 з пал. гадз. веч.

На 1-ы сэанс усе месцы па 30 і 40 кап.

ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ

МАПА БССР

выданьня Выш. Сав. Нар. Гаспадаркі БССР

З ДАКЛАДНЫМ ПАКАЗАНЬНЕМ

адміністрацыйнага падзелу і лясных масываў.

МАШТАБ 1:500000. ЦАНА 1 руб. 75 кап.

Набыць можна ва ўсіх магазынах Белдзяржвыдавецтва ў Менску і інш. гарадох БССР, або праз кіраўніцтва справаў ВСНГБ.

Да ведама анонсадаўцаў!

Кантора выдавецтва «Зьвязда» паведамляе, што

ПРЫЙМ АБВЕСТАК ВА ЎСЕ ВЫДАНЬНІ ВЫДАВЕЦТВА:

У газэты: „ЗЬВЯЗДА" „ОРКА" „Раўданасіс Артояс"

У часопісі: „Бальшавік Беларусі" „ПАРТРАБОТНІК" «Бел. Работніцы і Сялянка»

УТВАРАЕЦЦА ВЫКЛЮЧНА

канторай выдавецтва „ЗЬВЯЗДА"

г. Менск, Савецкая, 63. 3-ці паверх. Тэлеф. 7 61.

Менскі нафтасклад

САЮЗНЕФЦІ з 1 СТУДЗЕНЯ 1931 году

пераходзіць

на 5-дзённы тыдзень.

Дні адпачынку: 5, 10, 15, 20, 25 і 30 кожнага месяца.

НАФТАСКЛАД.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ ГРАМАДЗЯН.

Менрайсаднаносаюз

ЗАКУПАЕ ТРУСОЎ

па цане ад 5 да 18 руб. Звяртацца: Камсамольская 11, тэл. 2-98.

ЧЫТАЙЦЕ І РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ

цэнтральную польскую газэту

TRYBUNA RADZIECKA

GAZETA ROBOTNICZA

Wydawnictwo „Prawdy" organu KC WKP

„Трыбуна Радзецка" — выданьне «Правды»—органу ЦК УсеКП(б).

„Трыбуна Радзецка" — арганізуе польскія працоўныя масы ў СССР для барацьбы за прамфінплян, калектывізацыю, на польскую пралетарскую культуру, асьвятляе рэвалюцыйную барацьбу працоўных мас фашыстскай Польшчы.

Выпісваць газэту можна толькі на пошце і ў лістаносцаў.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 мес.—30 к., 3 мес.—85 к., 6 мес.—1 р. 60 к., 12 мес.—3 руб.

Каб упікнуць поправку у высылцы газэты, адначасна падпіску заразжа.

ПУХАВІЦКАМУ РАЙСЕЛЬБАНКУ

ПАТРЭБНЫ: 1 бухгальтар, 1 эканаміст-плянавік.

Зарплата ня менш 150 руб.

Пісаць на адрасе: Пухавічы, Райсельбанк.

Сад „ПРАФІНТЭРН" 1-га студзеня 1931 г.

АДЧЫНЯЮЦЦА

2 КАТКІ 2

Цэнтральны (на спартыўнай пляцоўцы) АДЧЫНЕН з 6—11 г. веч.

ПРАКАТ КРЭСЛАЎ з 6—11 г. веч.

ЦЁПЛАЕ ПАМЯШКАНЬНЕ БУФЭТ РАЗЬДЗЯВАЛКІ.

ЛЫЖНАЯ СТАНЦЫЯ ПРАКАТ лыжкоў і лыж з 11—4 г. дня і 7—11 г. веч.

Вучэбны на вялікдроку трэку АДЧЫНЕН з 11—4 дня і 7—11 ч. веч.

Каса цэнтральнага катка адчынена з 6—10 г. веч.
„ вучэбнага „ „ „ 11—2 г. і 7—10 г. веч.

Калектыў і вучні 35 школы вымушаны сваёй глыбокае спачуваньне сям'і таварыша загадчыка школы № 35

т. КАЛІНОЎСКАГА М. І.

31-га сьнежня г. г.

у «Доме Пісьменьніка» а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца АРГАНІЗАЦЫЙНЫ СХОД,

прысьвечаны арганізацыі ТАВАРЫСТАЎ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦАЎ-МАРКСЫСТАЎ.

ЗАПРАШАЮЦЦА ТАВАРЫШЫ: А. Сянкевіч, О. Канакоцін, С. Будзінскі, Я. Ліманоўскі, П. Іванаў, Р. Мурашка, В. Бенцэ, Гурскі, В. Сэрбэнта, Рымашэўскі, Ерошэйн, Гальперына, М. Лынько, А. Нікіпашэвіч, С. Я. Вальфсон, Вансоўскі, Вітэнзон, Я. Сякерская, В. Вольскі, Сталевіч, М. Гарот, А. Александровіч, Лунец, Якушэвіч, М. Ляхновіч, Варысёнак, Рубіна, Дворніна, Кобар.

ВЯЧЭРНІ СЭКТАР КАМВУЗУ ІМЯ ЛЕНІНА

паведамляе, што з 1-га студзеня, у памяшк. Камвузу 2-гі паверх, пак. № 22, у 7 гадз. веч.

адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД УСІХ ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ НА ГАЗЭТНЫ СЭКТАР ВКУ.

Яўка абавязкова.

У Ленінградзе пры Інстытуце прадзіўных культур з 1-га лютага 1931 году Ільнакавляхтрэстам адкрываецца

агнягадовыя КУРСЫ па падрыхтоўцы дырэктароў ільнакавляводчых гаспадарак.

Для БССР на памянёныя курсы прадпісана тэрмінам на 4 месяцы. Жадаючыя паступіць на курсы павінны адпавядаць наступным запатрабаваньням: а) Ня менш 3-х год стажу кіруючай партыйнай, прафесыянальнай і савецка-адміністрацыйнай гаспадарчай работы ў акруговым маштабе; б) Партстаж ня менш 5 год; в) Узрост ня больш 40 год; г) Веданьне поўнага курсу пачатковай арыфметыкі; д) Палітычная падрыхтоўка ў абсеме Саўпартшколы.

Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй у памеры 175 руб. у месяц, інтэрнатам, вучэбнымі прыладамі—падручнікамі, праезд на курсы і назад за кошт трэсту. Асобы, маючыя больш аднаго утрыманца, атрымліваюць стыпэндыю ў памеры 200 рублёў.

Жадаючыя паступіць на памянёныя курсы павінны падаць заявы, прыкладаючы адпаведныя дакументы з характарыстыкамі партарганізацыі разьней 31-га сьнежня г. г.

Вынікі і тэрміны яўкі на курсы будзе паведамлены дадаткова.

За розными даведкамі на пытаньні прыёму на курсы неабходна зьвярнуцца ў Аддзел Кадраў ЦК КП(б)Б (пакой № 6) і Наркамзем Бел. пакой № 29 да т. Ярмініна.

АДДЗЕЛ КАДРАЎ ЦК КП(б)Б.

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА ГАЛІЦЫ ЎЗЕЛЕНДАЛЬОП

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Совэтаў

АДКРЫТА ад 9 г. ран. да 9 г. увеч.

Прыём хворых на ўсіх спэцыяльнасьцях.

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурна-венэрычных, страўніцкіх, нервовых.

ЭЛЕКТРА-СЬВЕТА-ЛЯЧЭНЬНЕ і КВАРЦ адкрыты з 5—8 гадз. увеч.

РЭНТГЕН (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г. да 6 г. увеч.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. штодзен.

КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРАФЭСАРОЎ па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс з 9 г. раніцы да 9 г. увеч.

Прыём хворых па пакоўных кніжках мітэту. Для ўсіх іншых грамадзян агульнадаступную дыфэрэнцыяльную плату.

ЛЕНІНГРАДЗКАЕ АБЛАСНОЕ ВЫДАВЕЦТВА

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА 1931 ГОД

на двухтыднёвую ілюстраваную папулярна - навуковую часопісь

„ВЕСТНІК ЗНАНІЯ"

„ВЕСТНІК ЗНАНІЯ" ставіць сваёй задачай служыць дапаможнікам для самаадукацыі.

„ВЕСТНІК ЗНАНІЯ"—асьвятляе на сваіх старонках дасягненьні сусьветнай навуковай думкі.

„ВЕСТНІК ЗНАНІЯ"—асабліваю ўвагу аддае посьпехам савецкай навукі.

„ВЕСТНІК ЗНАНІЯ"—незьменны даведнік для кожнага культурнага чалавека нашай краіны.

На працягу 1931 г. падпісчыкі атрымаюць 24 нумары часопісі, багата ілюстраваныя фатаграфіямі, малюнкамі і чарцяжамі.

6 сэрый прылажэньняў:

1-ая сэрыя: 6 кніг „Жыцьцё жывотных" Брэма.

Ня ва перапрацаванае выданьне. Звыш 1.000 ставонак тэксту з багатымі ілюстрацыямі на ўкладных лістох.

2-ая сэрыя: 6 кніг „Класікі мировой навукі".

Біяграфіі і асновы вучэньня галіяк дзеячоў навукі.

3-ая сэрыя: Навука ў плякатах 12 плякатаў.

Разьмерам у альбомны аркуш, надрукаваны ў чатыры фарбы.

Плякаты наглядна паказваюць дасягненьні навуковай думкі ва ўсіх галінах ведаў.

4-ая сэрыя: 2 кнігі „Навука в картинах - конспектах".

Асьцудныя палажэньні навукі ў простых і даступна-даступных малюнках, схэмах, чарцяжох і таблицах, якія паказ кароткія артыкулы і заметкі, папулярна-выкладзенага распумачальнага тэксту.

5-ая сэрыя: 24 нумары часопісі „Природа і люди".

Навуковая бібліятэка. Географія і этнаграфія. Малюнкі быту і працы розных народаў сьвету і СССР. Захапляючыя апісаньні падарожжаў і новых вынаходак. Малюнкі жыцьця рэдкіх жывёлін і расьлін. Барацьба з вагатэка і сьцыкі і гарэлды. Будучае чалавецтва ў сьвяце навейшых дасягненьняў навукі і технікі. Навуковыя вопыты і назіраньні.

6-ая сэрыя: 24 кн. „Популярно - научной библиотеки", якая складаецца з аддзелаў: 1) Гісторыя ведаў аб зямлі і народзе. 2) Гісторыя навукі ў сучаснай навуцы. 3) Чытырыны аддзел 4) Аддзел марксыцкай філясофіі. 5) Гісторыя навукі. 6) Навука і вытворчасьць.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

„Вестник Знания" без прыл. 1 м.—70 к., 3 м.—1 р. 70 к., 6 м.—3 р. 20 к., 12 м.—6 р. 30 к., 12 мес.—8 руб. 50 к.

„Вестник Знания" з прыл. 6 кн. БРЭМА „Жизнь животных": 6 м.—4 р. 50 к., 12 мес.—7 р. 50 к.

Гадавым падпісчыкам растэрміноўка: 1 студз.—2 р. 50 к., 1 красавіка—2 р., 1 ліп.—2 р., 1 кастр.—2 руб.

„Вестник Знания" з прыл. 6 кн. „Классики мировой науки": 6 м.—4 р. 50 к., 12 мес.—7 р. 50 к.

Гадавым падпісчыкам растэрміноўка: 1 студз.—2 р. 50 к., 1 крас.—2 р., 1 ліп.—2 руб., 1 кастр.—2 руб.

„Вестник Знания" з прыл. „Наука в плякатах". 12 плякатаў у чатыры фарбы: 3 м.—2 р. 70 к., 6 м.—5 р. 20 к., 12 м.—10 р.

Гадавым падпісчыкам растэрміноўка: 1 студз.—3 р., 1 крас.—2 р., 1 ліп.—3 р., 1 кастр.—2 рублі.

„Вестник Знания" з прыл. „Наука в картинах - конспектах": 6 мес.—4 р., 12 мес.—7 р. 60 к.

Гадавым падпісчыкам растэрміноўка: 1 студз.—4 р., 1 ліп.—3 р. 60 к.

„Вестник Знания" з прыл. 24 нумар. часопісі „Природа и люди": 1 м.—1 р. 3 м. 3 р. 20 к., 6 м.—6 р. 20 к., 12 м.—12 р.

Гадавым падпісчыкам растэрміноўка: 1 студз.—4 руб., 1 крас.—3 руб., 1 ліп.—3 руб., 1 кастр. 2 руб.

„Вестник Знания" з прыладам. 24 кніг „Популярно-научной библиотеки": 1 м.—1 р., 3 м.—2 р. 70 к., 6 м.—5 р. 20 к., 12 м.—10 р.

Гадавым падпісчыкам растэрміноўка: 1 студз.—3 руб., 1